# ДА ПАЎНАВАРТАСНАГА ПАРТНЁРСТВА

**Французскі бок спадзяецца, што распачатае паляпшэнне адносінаў Беларусі з ЕС будзе працягвацца.**

Нядаўнія візіты высокапастаўленых еўрапейскіх чыноўнікаў у Беларусь сведчаць аб узрастанні інтарэсу да паляпшэння адносінаў з рэспублікай з боку ЕС — лічыць **пасол Францыі ў Беларусі Мірэй МЮСО.** «Паводле нашага меркавання, многае яшчэ павінна быць зроблена на гэтым шляху», — дадала дыпламат. Сярод здзейсненых пазітыўных крокаў яна адзначыла дыскусіі па ўдасканаленні выбарчага кодэксу, работы прафсаюзаў, а сярод пакуль нерэалізаванага — змены ў Крымінальным кодэксе. Рэзюмуючы сказанае пра магчымыя пераўтварэнні, пасол падкрэсліла: «У дачыненні да Беларусі ў нас вялікія планы — мы спадзяёмся, што Беларусь зойме сваё месца ў еўрапейскай сям'і, будзе сябраваць і камунікаваць са сваімі суседзямі на плённай аснове». Яна выказала спадзяванне, што распачатыя паляпшэнні ў адносінах будуць працягвацца і прывядуць да таго, што Беларусь стане паўнавартасным партнёрам Еўрапейскага саюза.

Сваю ролю ў працэсе паляпшэння адносінаў адыграла і Францыя, якая, дарэчы, летась старшынствавала ў ЕС (з ліпеня па снежань), а таксама выконвала функцыі старшыні ад імя Славеніі (са студзеня па чэрвень) у Беларусі. Нягледзячы на шматлікія крызісы, еўрапейцы захавалі курс на прыярытэтныя кірункі, пра якія было заяўлена. На думку пасла, некаторыя з іх уяўляюць цікавасць і для Беларусі, асабліва ў тым, што датычыць дакументаў у галіне энергетыкі, клімату. А канферэнцыя, якая мае адбыцца ў снежні 2009 года ў Капенгагене, стане штуршком для рашэння многіх праблем сектара. Дыпламат выказала меркаванне, што Беларусь актыўна ўключыцца ў гэту работу. М. Мюсо таксама звярнула ўвагу на пакт аб іміграцыі і дазволе на прыстанішча, распрацаваны і падпісаны падчас старшынства Францыі ў ЕС. Акцэнт таксама быў зроблены на дакумент у галіне бяспекі і абароны, які дазволіць актыўна працаваць у сферы папярэджання тэрарыстычных дзеянняў, распаўсюджвання зброі. Дасягнута пагадненне аб стане агульнаеўрапейскай сельскагаспадарчай палітыкі. Міжземнаморскі саюз, аснову якога заклала Францыя падчас свайго старшынства, атрымаў працяг, ураўнаважыўся Усходнім партнёрствам, заўважыла кіраўнік дыпмісіі, гэта якраз лагічнае завяршэнне, лагічны падыход да паляпшэння адносінаў паміж Беларуссю і ЕС.

Кіраўнік дыпмісіі назвала мінулы год вельмі паспяховым у стасунках паміж Францыяй і Беларуссю. «У двухбаковых адносінах у нас няма ніякіх праблем», — запэўніла М. Мюсо.

Эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў актывізуецца. Адбыўся візіт дэлегацыі MEDEF International у Беларусь. Дыпламат зрабіла ўнёсак у развіццё бізнэс-кантактаў Беларусі і Францыі. Падчас камандзіроўкі ў Маскву, дзе М. Мюсо ўдзельнічала ў пасяджэнні кіраўнікоў французскіх прадпрыемстваў, якія працуюць на расійскім рынку, дыпламат прапанавала іх увазе патэнцыял беларускага рынку. «Думаю, увосень 2009 года мы можам запрасіць сюды кіраўнікоў французскіх прадпрыемстваў, што працуюць на расійскім рынку, каб яны пабачылі, якія магчымасці дае ім беларускі рынак». Акрамя таго, на працягу апошніх некалькіх месяцаў некаторыя кіраўнікі французскіх прадпрыемстваў ужо наведалі Беларусь, азнаёміліся з магчымасцямі ў эканамічнай сферы і чакаюць канкрэтызацыі праектаў. «Гэта павысіць эканамічную прысутнасць Францыі ў Беларусі», — рэзюмавала пасол. Яна таксама выказала спадзяванне, што будзе атрыманая падтрымка беларускіх уладаў, каб гэтыя праекты былі паспяхова рэалізаваныя.

М. Мюсо паведаміла, што літаральна праз некалькі дзён чакаецца падпісанне міжурадавага пагаднення аб аздараўленні беларускіх дзяцей, якія пацярпелі ад наступстваў чарнобыльскай аварыі, у Францыі. Працэдура знаходзіцца на завяршальнай стадыі, засталося вырашыць некаторыя тэхнічныя моманты. Супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы — шматвектарнае. Старшыня аднаго з найбуйнейшых Напалеонаўскіх фондаў Францыі хацеў бы прапрацаваць пытанне аб стварэнні культурнага цэнтра ў Беларусі да лістапада 2012 года (200-годдзе пераправы войскаў Напалеона праз Бярэзіну). А ўжо ў гэтым месяцы французская здымачная група прыбудзе ў Беларусь, каб стварыць дакументальны фільм пра Нацыянальную бібліятэку.

«Мы хочам, каб Еўропа стала кантынентам міру, дабрабыту і сяброўства паміж народамі. А для гэтага трэба, каб усе народы, усе ўрады падзялялі агульныя каштоўнасці», — заключыла Мірэй Мюсо.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Прэзідэнт Беларусі памілаваў 21 асуджанага

Указамі Прэзідэнта Беларусі ад 9 ліпеня памілаваны 21 асуджаны да пазбаўлення волі і вызвалены ў дасудовым парадку ад крымінальнай адказнасці 45 чалавек, якія кампенсавалі ўрон, прычынены злачынствамі ў сферы эканомікі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Парламенцкі дзённік

# Беларуска-эстонскі старт

**Падчас сустрэчы ў Савеце Рэспублікі Ніна Мазай, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, назвала стварэнне групы па парламенцкіх сувязях з Беларуссю добрым крокам да старту больш актыўнага палітычнага дыялогу. Сенатар падкрэсліла, што добрасуседскія, узаемавыгадныя адносіны з кранамі ЕС, краінамі-суседзямі, разглядаюцца як прыярытэтны кірунак. І парламенцкія сувязі могуць пасадзейнічаць выбудоўванню больш маштабнага як палітычнага, так і эканамічнага супрацоўніцтва.**

Кіраўнік дэпутацкай групы па парламенцкіх сувязях з Беларуссю Уладзімір Вельман у сваю чаргу адзначыў прафесіяналізм беларускага консула ў Эстоніі, работай якога ён цалкам здаволены: «Мы рэгулярна атрымліваем інфармацыю пра тое, што адбываецца ў Беларусі, і пра тое, што адбываецца ў Эстоніі пры ўдзеле беларускага консульства».

Па выніках 2008 года Эстонія займае 15-е месца па агульным таваразвароце сярод знешнегандлёвых партнёраў Беларусі па-за межамі СНД і 9-е месца — па аб'ёме беларускага экспарту. На восень запланаваны візіт у Беларусь міністра замежных спраў Эстоніі Урмаса Паэта ў сувязі з адкрыццём дыпламатычнага прадстаўніцтва ў нашай дзяржаве.

# Прыярытэтныя інавацыі

**Гэтымі днямі Мінск становіцца сталіцай навукі — тут сабраліся 50 прадстаўнікоў з 39 краін для таго, каб узяць удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў Міжнароднага навукова-тэхнічнага цэнтра (МНТЦ) і наведаць найбуйнейшыя навуковыя арганізацыі краіны. Спікер ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з замежнай дэлегацыяй на чале са старшынёй Савета кіраўнікоў МНТЦ Віктарам Алесі.**

У. Андрэйчанка падкрэсліў, што атрыманая з боку МНТЦ дапамога дазволіла пераарыентаваць работу навукоўцаў, якія займаліся ваеннымі распрацоўкамі, рэалізаваць праекты ў мірных мэтах, стварыць важныя лабараторыі, абуладкаваць іх сучасным абсталяваннем, не дапусціць уцечкі ноу-хау, тэхналогій у ваеннай тэматыцы. Палітык назваў інавацыйнае развіццё адным з галоўных прыярытэтаў нашай краіны. «Ключавы кірунак тут — развіццё навукі», — дадаў спікер. Ён адзначыў, што парламентарыі робяць пасільны ўнёсак у заканадаўчае забеспячэнне гэтай сферы. Прынятыя ўжо законы аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі, аб навуковай дзейнасці, аб навукова-тэхнічнай інфармацыі, аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці. У перспектыве ж — распрацоўка спецыяльнага закона ў галіне інавацыйнай дзейнасці, дзе павінны быць выразна сфармуляваныя мэты, задачы і прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне інавацыйнай дзейнасці, а таксама кірункі і формы яе дзяржаўнай падтрымкі, створаны роўныя ўмовы для ўсіх суб'ектаў у гэтай сферы.

Віктар Алесі адзначыў высокі ўзровень навукі і ведаў у Беларусі і выказаў зацікаўленасць у працягу супрацоўніцтва з нашай краінай. «На пасяджэнні Савета кіраўнікоў мы будзем разглядаць праекты, прапанаваныя беларускімі навукоўцамі. Спадзяюся, што некаторыя прапановы атрымаюць фінансавую падтрымку».

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

**ВНИМАНИЮ КРЕДИТОРОВ ОАО «АБРАЗИВХИМСНАБ»**

ОАО «Абразивхимснаб» сообщает об уменьшении своего уставного фонда. За дополнительной информацией и для предъявления требований о досрочном погашении обязательств обращаться по адресу: **г. Минск, ул. Орловская, дом 58, офис 217 и по телефону: (017) 210-19-90 (91).**

*УНП 190762155.*

БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСИМУЩЕСТВА

**ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЕ**

в **«Извещение об открытом аукционе по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с применением метода понижения начальной цены продажи»,** опубликованное ранее в газете «Звязда» в номере 123 от 07.07.2009 г., стр. 7: **минимальная цена продажи предмета аукциона, руб.: здание мазутохранилища и право заключения договора аренды земельного участка — 62 675 095, здание котельной и право заключения договора аренды земельного участка — 68 756 650.**

***Конт. тел.: (0162) 21 19 82, 23 44 06.***

*УНП 200020538.*

Падпіска-2009

# ШТО ВЫБІРАЦЬ? «ЗВЯЗДУ»!

## ШЧАСЛІЎЧЫКІ — З ПРЫЗАМІ

**Як мы і абяцалі, сёння друкуем спіс пераможцаў штоквартальнай звяздоўскай латарэі, розыгрыш якой адбыўся напярэдадні ў сценах рэдакцыі. Адразу хацелася б сказаць прыхільнікам газеты вялікі дзякуй за актыўнасць і адданасць найстарэйшаму беларускамоўнаму выданню. Па выніках падпісной кампаніі на 2-е паўгоддзе і трэці квартал 2009 года мы змаглі захаваць чытацкую аўдыторыю.**

Вось як размеркаваўся ўвесь прызавы фонд:

**Настольны гадзіннік з лагатыпам «Звязды»**

КОЗАК Міхаіл Васільевіч, в. Хатынічы, Ганцавіцкі раён, Брэсцкая вобласць.

САВЕЙКА Аляксандр Аляксандравіч, г. Шаркаўшчына, Віцебская вобласць.

ШЫШЛАКОВА Вольга Сцяпанаўна, в. Чырвоны Бераг-2, Жлобінскі раён, Гомельская вобласць.

ЧУБРЫК Таіса Уладзіміраўна, г. Навагрудак, Гродзенская вобласць.

ПАТШЫВАЛАВА Тамара Пятроўна, в. Сідараўка, Краснапольскі раён, Магілёўская вобласць.

ГУРАНОК Антон Іосіфавіч, в. Падбярэззе, Барысаўскі раён, Мінская вобласць.

СОТНІКАЎ Уладзімір Мікалаевіч, г. Мінск.

**Каляровы тэлевізар «Віцязь»**

МАРТЫЕНКА Лідзія Аляксандраўна, г. Мікашэвічы, Брэсцкая вобласць.

САБІНА Ірына Іванаўна, в. Галубічы, Глыбоцкі раён, Віцебская вобласць.

КУШНІР Лідзія Георгіеўна, в. Доўск, Рагачоўскі раён, Гомельская вобласць.

ВІНЧА Аляксандра Іванаўна, г. Ліда, Гродзенская вобласць.

ЛЫСЕЎСКІ Генадзь Мікалаевіч, г. Горкі, Магілёўская вобласць.

ГАНЧАРЭВІЧ Мікалай Нікіфаравіч, в. Міхейкі, Слуцкі раён, Мінская вобласць.

КАЛЕСНІК Валянціна Іванаўна, г. Мінск.

**Халадзільнік «Атлант»**

ШАРЛАН Таццяна Віктараўна, г. Іўе, Гродзенская вобласць.

***Яшчэ раз віншуем усіх з выйгрышамі. Спадзяёмся, што ў наступны раз удача ўсміхнецца тым, хто вельмі гэтага хоча.***

Просім прабачэння, калі ў спісы раптам укралася недакладнасць, паколькі не ўсе прозвішчы і населеныя пункты напісаны разборліва.

**Свае прызы, паважаныя падпісчыкі, можна атрымаць у рэдакцыі газеты «Звязда» (г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 5-ы паверх) пры прад'яўленні пашпарта і квітанцыі аб падпісцы.**

**Кант. тэлефоны: 8 017 287 19 19; 287 17 79.**

***А суперпрызы -- халадзільнік і тэлевізары -- супрацоўнікі газеты даставяць вам у найбліжэйшы час, калі пачнецца новая падпісная кампанія, і ўручаць ва ўрачыстых абставінах з удзелам кіраўніцтва раённай «вертыкалі» і РУП «Белпошта».***

Заставайцеся з намі, гуляйце і выйгравайце!

**Кар. «Звязды».**

## Замест пасляслоўя

**...Мусіць, яшчэ раз: калі б розыгрышу прызоў не было, яго трэба было б прыдумаць. Для таго, каб разам з карткамі атрымаць яшчэ і сотні лістоў.**

Што ў іх? Ну па-першае, мноства цёплых слоў-кампліментаў — у адрас выдання, у адрас асобных яго журналістаў (а добрае слова, як вядома, і котцы прыемна...). Па-другое — клопат за лёс нашай роднай мовы, за лёс адзінай беларускамоўнай газеты... Па-трэцяе, канкрэтныя заўвагі па паляпшэнню зместу яе, па правядзенню падпісных кампаній. *«Вынікі іх у многім залежаць ад паштавікоў,* — піша прынамсі ***спадар СПІРЫДОВІЧ з Івянца,*** *— дык, магчыма, рэдакцыі трэба было б больш заахвочваць паштальёнаў і эканоміць на прызах для сваіх чытачоў? Бо яны , чытачы (я мяркую па сабе з жонкай) выпісваюць газету зусім не для таго, каб нешта выйграваць, яны, як і мы, любяць «Звязду», хочуць чытаць па-беларуску і гэта галоўнае!»*

Амаль усё жыццё (як піша) Міхаіл Аляксеевіч пражыў у Расіі. Цяпер — вярнуўся. Але вярнуўся «як быццам, бо ў гэта цяжка паверыць, калі мова спрэс руская...».

Чуць яе і наноў вывучаць дапамагае людзям «Звязда».

*«На слыху выраз пра тое, што яна старэйшая, беларуская і адзіная беларускамоўная, — чытаем у другім лісце, ад* ***Вольгі ФАЛЕЙЧЫК з в. Цырын Карэліцкага раёна,*** *— і я ну ніяк не магу зразумець, што ў голасе рэкламадаўцаў — гонар, радасць, смутак? На мой погляд, трэба біць трывогу: «Звязда» не можа быць круглай сіратой. Мова — душа народа. Жыве яна, жыве нацыя. Як жа данесці гэта да кожнага беларуса?»*

Цяжка. Складана. Але газета спрабуе гэта рабіць. І, дзякаваць Богу, тут яна не адна: ёсць у краіне інтэлігенцыя, эліта грамадства, ёсць — вялікая армія сапраўдных Настаўнікаў, ёсць чытачы, якія прапагандуюць «Звязду», якія выпісваюць яе для сваіх родных, сяброў альбо нават зусім незнаёмых, бо дабрачыннікі, бо чаго не зробіш, любячы. *«У сталым узросце ўжо цяжка знаходзіць новых сяброў, —* піша ***Соф'я Парфір'еўна КУСЯНКОВА з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна,*** *— але гэта здараецца. З Аляксандрай Іванаўнай Данчанка мы пасябравалі, калі даведаліся, што абедзве — даўнія падпісчыцы, прыхільніцы «Звязды». І ведаеце, што мяне ўразіла, што яна, едучы з дзеткамі (працуе настаўніцай) на аздараўленне ў Аўстрыю, заўсёды бярэ з сабой не нейкія там «дамскія раманы», а загадзя адкладзеныя нумары «Звязды», каб перачытаць, каб падумаць, каб там, за мяжой, «пачуць» сваю родную мову».*

Але гэта яшчэ не ўсё, як паведамляе спадарыня Кусянкова, — тыя перачытаныя газеты Аляксандра Іванаўна потым... прывозіць дамоў, бо... не хоча пакідаць «Звязду» на чужыне.

Якое яшчэ выданне можа пахваліцца такімі чытачамі, такімі сябрамі? Бяромся сцвярджаць — толькі наша! І таму яшчэ раз шчыра дзякуем усім, хто ў чарговы ці ў першы раз падпісаўся, і смуткуем, што зрабілі гэта не ўсе, хто, магчыма, і вельмі хацеў: ва ўмовах растучых цэн на прадукты, лекі і іншае газета, на жаль, не ўсім па кішэні. Былі ў пошце лісты аб тым, што трэба змяніць яе фармат і аб'ём, выдаваць не пяць разоў на тыдзень, а, напрыклад, чатыры... І тым самым зрабіць больш таннай.

Нехта з чытачоў, калі папрасілі выказацца («Звязда», 11 чэрвеня) падтрымаў гэтыя прапановы, нехта — не. Працытаваць жа хацелася б толькі адзін ліст. *«Звязду» выпісваю каля 60 гадоў, — піша* ***Васіль Іванавіч КУРНЕВІЧ з вёскі Боркі Уздзенскага раёна.*** *— Газета добрая і карысная. Фармат і ўсё іншае мяняць, па-мойму, не трэба. Адзіная на роднай мове рэспубліканская газета не павінна дайсці да аб'ёму раёнкі. А што дарагавата — праўда. Быў бы большы тыраж, была б таннейшая».*

Павелічэнне яго, цудоўна разумеем, залежыць ад зместу, ад афармлення, ад работы пошты, ад рэкламы, ад узроўню, скажам так, беларускасці нашых людзей, ад іх дабрабыту і многага іншага.

А яшчэ, як высветлілася, ад... назвы. *«Эпіграф «Звязды», —* чытаем у чарговым лісце (не будзем называць, ад каго і адкуль), — *«Родная газета на роднай мове». І крыўдна, вельмі крыўдна, што ў ёй, нашай Мове не знайшлося беларускага слова для назвы! У якім жа слоўніку можна знайсці гэту? У руска-беларускіх: звезда — зорка, у беларуска-рускіх — зорка — звезда...*

*А далей-болей — у адным з юбілейных нумароў газеты напрыканцы артыкула «Так ці не?» знаўца мовы Анатоль Клышка піша: «...Паслухаем размову:*

*— Ты любіш чытаць газету «Звязда»?*

*— Люблю.*

*— «Звязду»?*

*— «Звязду».*

*— А ці падпісаўся ты на яе?*

*— Так, падпісаўся.*

*— На паўгода?*

*— На паўгода.».*

*І завяршаецца гэты артыкул узнёслым прызнаннем, што ўсё ў гэтым дыялогу правільна, усё па-беларуску! Атрымліваецца, што калі вучань у сачыненні выкарыстае слова звязда, то памылкай гэта не будзе? І адзнаку яму не знізяць? На тэсціраванні таксама — калі будзе заданне выбраць беларускамоўнае слова, то...*

*То скажыце,* — просіць аўтар ліста, *— што яму трэба выбіраць: звязду ці ўсё ж зорку?..»*

На гэта пытанне са старонак газеты мы адказвалі. І, мусіць, не раз. Але ж для новых падпісчыкаў, для тых хто гэту інфармацыю прапусціў, адкрыем, так бы мовіць, «Беларускую энцыклапедыю» (Мінск, 1998 г., т. 7). Паводле яе, «Звязда» — гэта, па-першае, штодзённая грамадска-палітычная газета, якая выходзіць з 1917-га года... А, па другое — рухомая шматпрамянёвая асветленая знутры зорка на кіі, з якой хадзілі так званыя звездары, атрыбут каляднай абраднасці...

Далей ідзе досыць падрабязны расказ пра тое, з чаго і як ён, гэты атрыбут, рабіўся, чым упрыгожваўся, а таксама фатаграфія хлопчыка з вёскі Капылы Камянецкага раёна з гатовым вырабам.

Здымак, дарэчы, зроблены ў 40-я гады. Звычай нашэння звязды, як паведамляе энцыклапедыя, быў пашыраны да 20-30-х гадоў. Само сабой — мінулага стагоддзя.

Але і ў гэтым падчас Каляд звёзды, як сімвал сонца», па-ранейшаму «загараюцца»! Ахвотныя пераапранаюцца ў «мядзведзя», «казу» і «жорава», ходзяць па хатах — віншуюць гаспадароў, спяваюць жартоўныя песні і частуюцца, варожаць, гуляюць у «яшчара» і «жаніцьбу Цярэшкі»...

У вёсцы, дзе жыве аўтарка пытання, гэты абрад, відаць, не захаваўся. Але ж адрадзіць яго можна! Варта толькі захацець. Распытаць дзядоў і бабуль, якія, спадзяемся, помняць, што звязда — слова беларускае! Газета — таксама.

То, калі ласка, скажыце пра гэта сваім сямейнікам, сваім суседзям, сябрам, супрацоўнікам, дайце пачытаць ім цікавыя артыкулы і нумары, скажыце, што з газетай можна выйграць... І тады мо чытачоў-падпісчыкаў у «Звязды» стане больш? І тады мо гучней загучыць наша слова?

**Чытала лісты Валянціна ДОЎНАР.**

## Дырэктары прадпрыемстваў павінны быць абаронены ў выпадку апраўданай рызыкі пры прыняцці рашэнняў

**Такая прапанова, ініцыяваная Канфедэрацыяй прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (наймальнікаў) (КПП(Н), падтрымана дзяржорганамі. Аб гэтым паведаміў старшыня канфедэрацыі Анатоль ХАРЛАП.**

«У выніку канструктыўнай работы з Генеральнай пракуратурай, Вышэйшым гаспадарчым судом мы практычна вырашылі адну з праблем, якая непакоіць дырэктарскі корпус, прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў краіны», — адзначыў ён. Размова ідзе аб крымінальнай адказнасці службовых асобаў, суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці за наступствы, звязаныя з апраўданымі вытворча-гаспадарчымі рызыкамі, пры прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў, пры любой упушчанай выгадзе «або нейкіх, нават нязначных, стратах на прадпрыемстве». У сувязі з гэтым пры падтрымцы ўрада Генеральная пракуратура з удзелам іншых дзяржаўных органаў падрыхтавала адпаведныя прапановы па змяненні Крымінальнага кодэкса. «Прадугледжваецца пакаранне толькі за наўмысныя дзеянні з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці, але ні ў якім выпадку не за апраўданыя рызыкі пры прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў», — адзначыў старшыня канфедэрацыі. Цяпер законапраект рыхтуецца да ўнясення ў парламент і будзе разгледжаны на асенняй сесіі.

**БЕЛТА.**

## Сетка пунктаў прыёму шклатары ад насельніцтва будзе пашырана

**У Беларусі будзе пашырана сетка пунктаў прыёму шклатары ад насельніцтва. Адпаведнае рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 896.**

Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даручана забяспечыць развіццё сеткі прыёмных пунктаў зваротнай шкляной тары ад насельніцтва. Пры гэтым прадугледжваецца іх абавязковае функцыянаванне ў гандлёвых аб'ектах, якія рэалізуюць харчовыя тавары з гандлёвай плошчай больш як 1000 кв.м, з абсталяваннем асобнага ўваходу. Работа прыёмных пунктаў павінна быць арганізавана ў зручны для насельніцтва час, забяспечваючы бесперашкодны прыём усіх відаў запатрабаванай перапрацоўчымі арганізацыямі рэспублікі зваротнай шкляной тары.

**БЕЛТА.**

## Абзац

◢ Закупныя цэны на авёс і ячмень, што пастаўляюцца ў лік дзяржзаказу для вытворчасці круп, павялічыліся на 25%, на алейнае насенне рапсу — знізіліся на 9 %. Закупныя цэны на іншыя віды раслінаводчай прадукцыі, што пастаўляецца ў лік дзяржаўных патрэбаў, засталіся на ранейшым узроўні. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета Міністраў № 900 ад 6 ліпеня г.г.

◢ **Двое дзяцей загінулі і яшчэ двое пацярпелі ад удару маланкі ў Стоўбцах. На вуліцы Зялёнай у 30 м ад чыгуначнага моста маланка трапіла ў групу дзяцей. Два хлопчыкі, абодва 1994 г.н., загінулі на месцы. Яшчэ адзін хлопчык у цяжкім стане быў шпіталізаваны, а ў іншага — больш лёгкая ступень паражэння. Побач з месцам здарэння знойдзены мабільны тэлефон. Мяркуецца, што менавіта ён стаў прычынай пападання маланкі.**

◢ Вытворчыя памяшканні агракамбіната «Сноў» Нясвіжскага раёна пацярпелі ў выніку моцнага ветру. У вёсцы Церасполле з дахаў сарвана 6 тыс. лістоў шыферу. Пашкоджаны 14 будынкаў птушнікаў, адміністрацыйны будынак, памяшканне вагавой. Людзі не пацярпелі. Аварыйныя брыгады вядуць аднаўленчыя работы.

◢ **Практычна цэлая сям'я загінула на пажары ў Віцебскім раёне. Трагедыя адбылася позна ўвечары ў вёсцы Кузняцоўка Суражскага пасялковага Савета. Пакінутыя без нагляду дарослых два хлопчыкі, 2002 і 2004 г.н., гулялі ў пакоі. Бацькі былі на верандзе. Праз некаторы час бацька заўважыў агонь і пайшоў у памяшканне, у якім знаходзіліся дзеці. У гэты ж час па званку суседзяў прыехалі выратавальнікі, якія ліквідавалі загаранне, аднак выратаваць дзяцей і іх бацьку не ўдалося. У жывых засталіся толькі 38-гадовая маці і старэйшая дачка, якая ў той вечар не была дома. Паводле папярэдніх звестак, прычынай пажару стала дзіцячае свавольства з агнём.**

◢ Трагедыя адбылася на тэрыторыі малочна-таварнай фермы ААТ «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна — двое рабочых загінулі, яшчэ двое дастаўленыя ў рэанімацыю. На ферме прарвала водаправод, і для правядзення рамонтных работ у каналізацыйную шахту спусціліся два рабочыя — 1954 і 1968 г.н. Апынуўшыя ўнутры, яны страцілі прытомнасць. Ім на дапамогу спусціўся слесар, які таксама не змог выбрацца самастойна. На паверхню яго выцягнуў напарнік. Першыя два мужчыны загінулі, слесар і напарнік дастаўленыя ў бальніцу. Паводле папярэдняй праверкі, людзі атруціліся метанам, які сабраўся ў каналізацыйнай шахце.

## Поўны абзац

◢ **У ЗША аўтамабіліста пазбавілі волі на два месяцы за тое, што ён на машыне задушыў 10 качак і адну гусь. Птушкі былі пералётнымі і на стаянцы дзяўблі кукурузу, што ляжала на асфальце. Чарльз Мікс, які працаваў дастаўшчыкам ежы і ехаў па чарговым выкліку, знарок накіраваў свой аўтамабіль на чараду і задушыў некалькі птушак. Калі вінаваты пачуў прысуд — 30 сутак турмы — ён пачаў абурацца і аспрэчваць пакаранне. За няўвагу да суда яму дадалі яшчэ столькі ж, а таксама штраф у памеры 664 долары.**

◢ П'яны брытанец раздаў у аэрапорце 52 тыс. еўра. У іспанскім аэрапорце быў арыштаваны за празмерную шчодрасць і адпраўлены дадому грамадзянін Вялікабрытаніі. Як выявілася, зусім нядаўна мужчына атрымаў спадчыну і, будучы на добрым падпітку, вырашыў раздзяліць сваю радасць з навакольнымі. Тысячы еўра разыходзіліся ва ўсе бакі. Да арышту ён паспеў раздаць наяўнымі і дарожнымі чэкамі 52 тыс. еўра. Чалавек смяяўся і, як падалося паліцэйскім, зусім не разумеў, што робіць. Паліцэйскія ўгаварылі шчаслівага чалавека схаваць партаманет і вярнуцца дадому.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЕЎРАЗОНЕ ДАСЯГНУЛА РЭКОРДНАГА ЎЗРОЎНЮ

**Беспрацоўе ў еўразоне ў маі павысілася да 9,5 % — гэта самы высокі паказчык за апошнія 10 гадоў. Такія звесткі прыводзіць Еўрастат.**

У зоне ЕС-27 узровень беспрацоўя дасягнуў у маі 8,9 %, што на 0,2 працэнтныя пункты вышэй у параўнанні з красавікам гэтага года. Для ЕС-27 гэта самы высокі паказчык з чэрвеня 2005 года. Самы нізкі ўзровень беспрацоўя зафіксаваны ў Нідэрландах (3,2 %) і Аўстрыі (4,3 %), а самы высокі — у Іспаніі (18,7 %), Латвіі (16,3 %) і Эстоніі (15,6 %).

### ЛІДАРЫ G8 ВЫЗНАЧЫЛІСЯ З ІРАНАМ



**Лідары краін «вялікай васьмёркі» па выніках працоўнай вячэры ў італьянскай Аквіле, на якой абмяркоўваліся пытанні міжнароднага парадку дня, прынялі адзіную палітычную заяву, якая ўключала ў сябе праблематыку Ірана.**

Лідары G8 выказалі сур'ёзную заклапочанасць у сувязі з падзеямі, якія адбываюцца ў гэтай краіне пасля прэзідэнцкіх выбараў. Удзельнікі саміту пацвердзілі павагу суверэнітэту Ірана, але ў той жа час асудзілі гвалт, які меў месца пасля выбараў, што прывяло да чалавечых ахвяраў. Кіраўнікі краін «вялікай васьмёркі» заклікалі іранскія ўлады вырашаць узніклыя праблемы з дапамогай дэмакратычнага дыялогу на аснове прынцыпаў прававой дзяржавы. Акрамя таго, была прынятая заява па пытаннях нераспаўсюджання ядзернай зброі, а таксама па барацьбе з тэрарызмам. Лідары краін "Вялікай васьмёркі", а таксама "Вялікай пяцёркі" і Егіпта вырашылі ўстрымацца ад дэвальвацыі валют і дабівацца стабільнай міжнароднай фінансавай сістэмы.

### БАНКІ АБВЯСЦІЛІ ШВАРЦЭНЕГЕРУ БАЙКОТ



**Амерыканскія банкі націснулі на губернатара Каліфорніі Арнольда Шварцэнегера. Яны адмаўляюцца прымаць пазыковыя распіскі ўладаў штата.**

Найбуйнейшы па колькасці жыхароў амерыканскі штат Каліфорнія балансуе на грані банкруцтва. Эканоміка штата можа абваліцца, калі Шварцэнегер не пачне рабіць тэрміновыя крокі па пераадоленні бюджэтнага дэфіцыту больш за 26 мільярдаў долараў. Між тым, узровень беспрацоўя ў Каліфорніі ўжо перавысіў адзнаку ў 11%, а персанальныя прыбыткі каліфарнійцаў скараціліся ўпершыню з 1938 года.

### АД ВЫБУХУ ЗАГІНУЛІ 25 ЧАЛАВЕК

**Непадалёку ад Кабула перавярнуўся грузавік, які перавозіў выбухоўку.**

У момант, калі паліцэйскія спрабавалі адціснуць натоўп ад машыны, якая перакулілася, адбыўся выбух, у выніку якога загінулі 25 чалавек — 21 мясцовы жыхар і чацвёра паліцэйскіх. Сярод загінулых ёсць няпоўнагадовыя. Выбух адбыўся непадалёку ад школы. З'яўляецца выбух выпадковасцю або запланаваным тэрактам, пакуль невядома.

### НА ЧУЖЫ КАРЭНЬЧЫК...

**У Катманду шасцёра сялян загінулі ў бойцы за сродак ад імпатэнцыі.**

Некалькі дзясяткаў горкхаў — народа, які праславіўся ў Непале сваёй бясстрашнасцю і паўстаннямі супраць індыйскіх і брытанскіх вайскоўцаў, — прыйшлі з усходу ў надзеі сабраць ураджай ярсагумбы, моцнага расліннага афрадызіяку. Адзін кілаграм гэтай расліны каштуе каля 7—8 тысяч долараў. Горкхі прыкінуліся мясцовымі зборшчыкамі травы, але праз пару гадзін сельскія жыхары апазналі ў іх чужынцаў. Завязалася бойка, перараслая ў пабоішча, і вясковыя зборшчыкі забілі да смерці пяцярых горкхаў. Яшчэ двое з іх загінулі пры ўцёках. У Еўропе ярсагумба вядомая як «віягра на траве» і «гусенічны грыб». Расце яна толькі на вышыні 3500—5000 метраў. Тэрмін збору лекаў вельмі кароткі, не больш за месяц. Афрадызіяк моцна ўздзейнічае на сістэму палавых гармонаў і на цэнтры сэксуальнай узрушанасці ў мозгу, павышае лібіда, лечыць імпатэнцыю і бясплоддзе.



### ДВАІХ АДНЫМ СТРЭЛАМ

**Каўбойскія жарсці разыграліся ў вёсцы Кіцін Жлобінскага раёна.**

Падчас начной выпіўкі на траіх мужчыны пасварыліся, і два маладзейшыя (1966 і 1969 г.н.) пабілі старэйшага, 62-гадовага пенсіянера. Той пабег у хлеў і вярнуўся з абрэзам вінтоўкі Мосіна часоў Вялікай Айчыннай. Не доўга думаючы, зрабіў стрэл, у выніку якога аднаму з крыўдзіцеляў прабіў наскрозь жывот, а другому параніў левую ступню. Першы паранены хутка памёр у бальніцы. Калі на месца крывавай помсты прыехала міліцыя, пенсіянер здаў ім цэлы арсенал схаванай зброі. Акрамя абрэза вінтоўкі Мосіна, у яго былі назапашаны: абрэз карабіна «Маўзер», 2 патроны да яго і незарэгістраваная паляўнічая стрэльба маркі ІЖ-17.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Традыцыі і сучаснасць

# РОЎНА Ў 12 ГАДЗІН

**Штодзённа, роўна ў 12 гадзін, пажарны ў форменным адзенні XIX стагоддзя з пазалочанай трубой будзе падаваць музычныя сігналы з аглядной пляцоўкі пажарнай каланчы па вуліцы Замкавай, 19 у Гродне.**

Цяпер там, па-суседску з пажарнай аварыйна-выратавальнай часткай № 1 г. Гродна, размешчаны музей гісторыі пажарнай службы на Гродзеншчыне. Паводле інфармацыі начальніка цэнтра прапаганды і навучання Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Ігара Сандуленкі, у выкананні трубача-сігналіста Юрыя Мініна будуць гучаць самыя розныя мелодыі. Тым самым паведамляючы гараджанам, што пажарныя заўсёды напагатове і, як мае быць, выконваюць свае абавязкі.

НАША ДАВЕДКА.

*Пажарную вежу з цэглы пабудавалі ў Гродне ў 1902 годзе, хаця драўляная каланча ў гэтым месцы існавала і раней. Сёння на аглядной пляцоўцы каланчы за наваколлем уважліва назірае вусаты манекен-пажарны ў старадаўнім абмундзіраванні, а таксама ўсталяваная падзорная труба, каб з гэтай вышыні палюбавацца горадам.*



Фота БЕЛТА.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Кубак Дэвіса

# З македонцамі паспаборнічае паўфіналіст Уімблдона

## *Сёння ў Мінску пачынаецца вялікі тэніс*

**Сёння ў сталічным Палацы тэніса пачнецца тэнісны матч паміж камандамі Беларусі і Македоніі. Таму, хто прайграе, давядзецца супрацьстаяць восенню моцнай камандзе Славакіі дзеля права застацца ў першай групе Еўра-Афрыканскай зоны. Паводле жараб'ёўкі, першымі на корт выйдуць Дзімітар Грабулоўскі і Андрэй Васілеўскі, затым згуляюць Лазар Магдзінчаў і Уладзімір Ігнацік. У суботу на корце згуляюць парны матч: Максім Мірны і Аляксандр Буры будуць супрацьстаяць Дзімітару Грабулоўскаму і Лазару Магдзінчаву. У нядзелю матч завершыцца сустрэчамі Дзімітар Грабулоўскі — Уладзімір Ігнацік і Лазар Магдзінчаў — Андрэй Васілеўскі.**

Імёны ўдзельнікаў беларускай каманды для беларускага балельшчыка знаёмыя, акрамя 17-гадовага Андрэя Васілеўскага, які з'явіўся ў камандзе ў апошні момант. Яшчэ два дні таму замест яго там быў Павел Філін. Аднак капітан каманды Уладзімір Валчкоў абяцаную замену ўсё ж зрабіў, растлумачыўшы яе лепшай фізічнай і эмацыйнай гатоўнасцю Васілеўскага.

Андрэй расказвае, што ў зборную яго запрасілі за тыдзень да Кубка Дэвіса, пасля збору, на якім таленавітыя юнакі дэманстравалі сваю гульню. Дарэчы, Андрэй Васілеўкі сёлета быў адзіным прадстаўніком нашай краіны на юнацкім Уімблдоне і ў адзіночным разрадзе дайшоў да 1/16 фіналу, у парным — да паўфіналу. У 2008-м ён выйграў юніёрскі чэмпіянат Еўропы. Яго бацькі — трэнеры па тэнісе, і іншага выйсця, як займацца тэнісам, паводле прызнання Андрэя, у яго не было. Яго і зараз трэніруе тата Аляксандр Васілеўскі, які выхаваў нашу вядомую Настассю Якімаву. Свой стыль гульні Андрэй называе агрэсіўным, вось і пабачым, ці здолее ён разам з камандай супрацьстаяць македонцам. Адзіночныя сустрэчы пачынаюцца ў 10 гадзін на адкрытых кортах Палаца тэніса.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**Государственное производственное объединение «Минскстрой» 220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А**

***режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00-14.00, тел. приемной 227 78 70, тел.: 227 52 36, 226 03 01, 227 50 64.***

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. №140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2008 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

— ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, д. 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д.168, корп. 1, пр-т Независимости, д.168, корп. 2, ул. Есенина д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по генплану в квартале ул. Щорса — пр. Дзержинского с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 1 по генплану. Крышная газовая котельная № 4 по генплану. Повысительная насосная станция № 5 по генплану. Трансформаторная подстанция № 6 по генплану» в г. Минске.**

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из трех секций. На первом этаже запроектировано нежилое помещение. Количество жилых помещений жилого дома — 125, количество нежилых помещений — 1.

Начало строительства — декабрь 2008 года.

Окончание строительства— декабрь 2009 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:

— государственную экспертизу от 25.08.2008 года № 1975-5/08,

— государственную экологическую экспертизу 31.07.2008 года № 02-11/490.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 19.11.2008 г. № 500/147-4559.

Земельный участок площадью 0,2285 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить. Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, договоры будут заключаться на 10 однокомнатных квартир, 24 двухкомнатные квартиры (общей площадью от 70 кв.м), три трехкомнатные квартиры.

Стоимость строительства 1 м² жилых помещений для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет: однокомнатная квартира — 3 853 710 руб.; двухкомнатная квартира — 3 706 900 руб.; трехкомнатная квартира — 3 553 270 руб.

Стоимость строительства 1 м² жилых помещений для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет — 3 553 270 руб.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома — декабрь 2009 года.

Договор строительного подряда от 05.12.2008 № 3-К.

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, 311 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор А.П. Парфянович**

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

10 ЛІПЕНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА
№ 25 (15579)

Прыёмная кампанія-2009

# ЧАС ХВАЛЮЮЧАГА ЧАКАННЯ

**Для большай часткі беларускіх абітурыентаў экзаменацыйны марафон завяршыўся разам з заканчэннем цэнтралізаванага тэсціравання. І па меры абвяшчэння вынікаў ЦТ усе сталі падлічваць свае шанцы на паступленне. Уладальнікі сертыфікатаў з высокімі баламі больш-менш супакоіліся і сталі чакаць, калі прыёмныя камісіі распачнуць прыём дакументаў. Але ў вельмі многіх маладых людзей, нацэленых на паступленне ў ВНУ, якія аказаліся ў сярэдзіне стабальнай тэставай шкалы, «момант ісціны» яшчэ наперадзе.**

На шчасце, насуперак змрочным прагнозам аб звышконкурсах у ВНУ ў гэтым годзе, колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет не толькі не павялічылася, а нават крыху зменшылася — пра гэта можна меркаваць па колькасці ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Магчыма, што ад спробы паступаць у гэтым годзе адмовіліся выпускнікі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а таксама выпускнікі папярэдніх гадоў, якія апасаліся жорсткай канкурэнцыі. Усё ж такі колькасць выпускнікоў павялічылася сёлета на 9 працэнтаў, або на 9 тысяч чалавек. Аднак і план прыёму ў ВНУ на дзённую бюджэтную форму навучання ў гэтым годзе таксама быў павялічаны на 2 тысячы месцаў (ва ўстановах Міністэрства адукацыі — на 500, Міністэрства аховы здароўя — на 600, Міністэрства абароны — на 281 месца і г.д.) . Усяго на дзённую бюджэтную форму навучання плануецца прыняць 24,8 тысячы чалавек (гэта на 4,5 працэнта больш, чым у папярэднім годзе) і 7,9 тысячы — на завочную форму навучання (на ўзроўні мінулага года). На ўмовах аплаты ў дзяржаўныя ВНУ будуць залічаны на 1 800 чалавек больш, чым летась. Выходзіць, што абітурыенты 2009 года аказаліся нават у больш выйгрышным становішчы, чым іх папярэднікі. Да таго ж і прыёмная кампанія праходзіць сёлета па абноўленых правілах прыёму, якія сталі больш лаяльнымі для будучых музыкантаў, скульптараў, мастакоў, акцёраў, спевакоў, а таксама для маладых людзей, якія прыязджаюць з сельскай мясцовасці пры ўмове іх паступлення на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці. Да таго ж пашырыліся і кола прэтэндэнтаў на мэтавую падрыхтоўку.

**Візіт у прыёмную камісію лепш не адкладваць на апошні дзень, таму што такіх «разумнікаў» можа быць шмат. І сітуацыя з конкурсам можа змяніцца літаральна ў некалькі апошніх гадзін ці нават ужо пасля закрыцця прыёмных камісій.**

Так, Указ кіраўніка дзяржавы № 314 аб правядзенні эксперыменту пры залічэнні абітурыентаў у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі і Акадэмію мастацтваў адкрывае дарогу ў гэтыя ВНУ толькі самым таленавітым. Усё ж такі тут рыхтуюць для краіны ўнікальных майстроў, так бы мовіць, штучных спецыялістаў, таму і падыход да іх адбору павінен быць крыху іншым. Залічэнне абітурыентаў у акадэміі музыкі і мастацтваў будзе ажыццяўляцца па конкурсе на аснове агульнай сумы тэставых адзнак: сумы балаў за кожны этап уступных выпрабаванняў па прадмеце «творчасць» плюс сярэдні бал, атрыманы пры складанні балаў за цэнтралізаванае тэсціраванне (дзве адзнакі) і сярэдняй адзнакі дакумента аб адукацыі. Іншымі словамі, улічваюцца ўсе балы, атрыманыя на экзаменах па творчых дысцыплінах, а па агульнаадукацыйных прадметах — толькі агульны сярэдні бал. Гэта дае перавагі пры паступленні творчым адораным маладым людзям, прасцей кажучы, на першае месца выходзіць яго вялікасць Талент, а зусім не адзнакі ў сертыфікатах ЦТ. Пасля аналізу вынікаў эксперыменту будзе прымацца рашэнне або аб яго «ўзаконьванні» на будучае ў Правілах прыёму, або аб падаўжэнні эксперыменту яшчэ на год.

Больш прафесійна арыентаваным стане цяпер і набор на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці ў сельскагаспадарчых ВНУ. Там прадугледжаны прыём па асобным конкурсе абітурыентаў, якія навучаліся ў год паступлення на факультэтах даўніверсітэцкай падрыхтоўкі ці падрыхтоўчых аддзяленнях аграрных ВНУ і пражывалі ў сельскіх населеных пунктах не менш як два гады на момант атрымання адукацыі. Для арганізацыі асобнага конкурсу гэтых абітурыентаў прадугледжана квота да 20 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму. Да таго ж у рамках асобнага «сельскага конкурсу» пры паступленні на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю ў сельскагаспадарчыя ВНУ змогуць удзельнічаць абітурыенты, якія пражывалі ў сельскай мясцовасці не менш як два гады, аднак навучаліся ва ўстановах размешчаных у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу. Раней, як вядома, абавязковай умовай быў атэстат сельскай школы. Гэта звязана з тым, што малакамплектныя школы паступова закрываюцца, і іх вучні вымушаны наведваць школы ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, а затым канкураваць пры паступленні з гараджанамі, якія выбіраюць сельскагаспадарчыя спецыяльнасці пераважна з-за нізкага прахаднога бала, а затым не затрымліваюцца ў вёсцы. Але як у такім разе замацоўваць кадры ў сельскай гаспадарцы? У немалой ступені гэтаму спрыяе мэтавая падрыхтоўка, аб'ёмы якой былі павялічаны да 30 працэнтаў. Праўда, часта конкурс на мэтавае месца быў нават вышэйшы, чым увогуле на тую ці іншую спецыяльнасць. У такім выпадку страчвалася прыцягальнасць для абітурыента мэтавага накіравання. Таму цяпер ВНУ дазволена ажыццяўляць мэтавы набор пры конкурсе адзін чалавек на месца.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пашырыўся і пералік асобаў, якія могуць прэтэндаваць на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі — да абітурыентаў з сельскіх населеных пунктаў далучыліся абітурыенты, якія пражываюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек. Пералік гэтых пунктаў ёсць у кожнай прыёмнай камісіі.

**У 2009 годзе павялічаны прыём за кошт бюджэтных сродкаў на наступныя профілі навучання і напрамкі:**
***«Ахова здароўя» — на 27,6 працэнта;***
***«Служба бяспекі» (камп'ютарная бяспека, ядзерная і радыяцыйная бяспека, ваенныя спецыяльнасці) — на 19,8 працэнта;***
***«Архітэктура і будаўніцтва» — на 11,4 працэнта***
***«Экалагічныя навукі» — на 11 працэнтаў***
***«Турызм і гасцінасць» —у 1,5 раза***
***«Металургія» — на 46 працэнтаў;***
***«Інтэлектуальныя сістэмы» — на 33 працэнты;***
***«Геадэзія» — на 30 працэнтаў;***
***«Энергетыка» — на 9 працэнтаў.***

Яшчэ адно важнае нованаўвядзенне датычыцца адмены ніжняй мяжы тэставага бала. З гэтага года ўсім абітурыентам, якія атрымалі на цэнтралізаваным тэсціраванні адзін бал і больш, дадзена магчымасць удзельнічаць у конкурсе. У Міністэрстве адукацыі ўпэўненыя, што ўсё адно ў ВНУ паступяць самыя падрыхтаваныя абітурыенты, якія набяруць большую колькасць балаў, паколькі ЦТ цудоўна спраўляецца з задачай па іх ранжыраванні. Затое такая мера дапамажа запоўніць вострадэфіцытныя спецыяльнасці ў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, дзе было праблематычна ажыццяўляць набор прафесійна арыентаваных абітурыентаў з высокімі баламі ЦТ. Адмена ніжняй мяжы тэставага бала дазволіць адабраць там «сваіх» абітурыентаў, якія не толькі закончаць навучальную ўстанову, але і будуць працаваць па абранай спецыяльнасці. Сёлета было пашырана таксама кола асобаў, якія маюць права на льготы пры паступленні ў ВНУ. Скажам, выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія маюць стаж работы па спецыяльнасці не менш як два гады і паступаюць на завочную форму навучання па адпаведнай ці роднаснай спецыяльнасці, будуць мець пераважнае права на залічэнне пры аднолькавай колькасці набраных балаў.

9 ліпеня ў ВНУ «сілавых структур» і так званых творчых ВНУ ўжо распачаўся прыём дакументаў. Прыёмныя камісіі Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, Ваеннай акадэміі, Камандна-інжынернага інстытута і Гомельскага інжынернага інстытута МНС будуць весці прыём дакументаў на ўсе формы навучання *з 9 па 15 ліпеня*. Падаць дакументы ў гэтыя ж ВНУ на завочную і вячэрнюю формы навучання абітурыенты, якія вытрымалі ўступныя выпрабаванні, але не прайшлі па конкурсе на дзённую бюджэтную форму навучання, змогуць *па 21 ліпеня*, а для ўдзелу ў конкурсе на дзённую, завочную і вячэрнюю формы атрымання адукацыі на ўмовах аплаты дакументы будуць прымацца *да 23 ліпеня*.

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Акадэміі музыкі і Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры тэрміны прыёму дакументаў на ўсе формы навучання — *з 9 па 13 ліпеня*. Для абітурыентаў, якія не прайшлі па конкурсе на дзённую бюджэтную форму навучання, дакументы на завочную або вячэрнюю формы навучання будуць прымацца *па 25 ліпеня*, а на платную форму навучання — *па 27 ліпеня*.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

# МАЯ ШКОЛА ЖЫЦЦЯ

Здарылася так, што яму давялося стаць сапраўдным мужчынам вельмі рана, бо лёс усклаў на яго адказнасць не толькі за сябе самога, але яшчэ і за родных, блізкіх яму людзей. **Антон Аляксееў** — герой майго матэрыялу, у свае **19** ужо ведае, як гэта — працаваць адразу на некалькіх працах. Асноўныя навыкі, якімі ён цяпер валодае, давялося атрымліваць у самай жорсткай, часам нават бязлітаснай, навучальнай установе — школе жыцця. Кожны, хто праз яе прайшоў, разумее, наколькі складаная гэта навука, а тым больш, калі займаешся ёй 24 гадзіны ў суткі.

— Хочацца жыць, а не выжываць, таму і даводзіцца круціцца ў гэтым жыцці, — кажа Антон. — Я ўжо звыкся з тым, што на сон у сярэднім адпускаецца гадзіны тры-чатыры на дзень. Мне хапае.

Афіцыйны працоўны стаж у Антона пачаўся з 15 гадоў. Праўда, афіцыйнасць гэта ўмоўная, бо ўжо з 14 трэба было думаць аб забеспячэнні свайго матэрыяльнага становішча. Працоўная кніжка змяшчае тры запісы аб прыёме на працу, але ў сапраўднасці там іх павінна быць 9, калі не болей.

**— Скажы, калі ласка, якая была твая першая праца? — пытаюся ў свайго суразмоўцы.**

— Сталяр, — кажа Антон. — Наогул, дзе я толькі ні працаваў! І на будаўніцтве, і дыджэем у дзіцячых лагерах, і ў службе аховы ў начным клубе...

**— Ты ведаеш майстэрства стварэння музычных кампазіцый?**

— Агульную структуру працы дыджэя больш ці менш ведаю. Свае міксы не ствараю з-за недахопу часу і суадносна няпоўных ведаў. Але звесці трэкі змагу. Дзеці маёй працай былі задаволены. Я не магу без музыкі. Па жыцці заўсёды з плэерам. Можа, таму і пайшоў на працу ў начны клуб. Там музыка была амаль што круглыя суткі.

**— А цяпер дзе працуеш? Колькі прац сумяшчаеш?**

— Па-першае, я маркетолаг. Працую з мэбляй. Але гэта — маё хобі. Тут заробак сам па сабе не мае для мяне вялікай ролі. На гэтай працы я адпачываю, тут праяўляю сваю творчую натуру. Асноўная мая праца, якая, можна сказаць, мяне і корміць, — гэта служба аховы ў казіно. Праца нялёгкая, па праўдзе кажучы.

**— У сэнсе?**

— Пад раніцу надта цяжка нагам. Праца — увесь час на нагах.

**— Пры прыёме ў службу аховы ці звяртаюць увагу на тыя віды баявых мастацтваў, якімі чалавек валодае?**

— Звяртаюць, безумоўна.

**— І чым можаш пахваліцца ты?**

— Ну, па-першае, выдатнай фізічнай формай. Я — малады, прыгожы, здаровы *(усміхаецца)*. Па-другое, быў час, калі я займаўся гандболам. На жаль, цяпер з-за недахопу часу я не магу дазволіць сабе такой раскошы. І па-трэцяе, у мяне ёсць разрад па лёгкай атлетыцы. Баявымі мастацтвамі, праўда, я не займаюся. Але мне гэта не перашкаджае ў выкананні маіх службовых абавязкаў.

**— А як жа служба ў арміі?**

— Не. Я непрыдатны для вайсковай службы. Усё з-за маёй нагі. Тры аперацыі — гэта не смех.

**— Вось ты ўсё пра працу ды пра працу. А як жа асабістае жыццё? Ці знаходзіш ты час і на яго?**

— Мне пашанцавала, што я працую разам са сваёй каханай дзяўчынай. Такім чынам нам даводзіцца бачыцца часта. А вось на адпачынак часу не хапае. Цяпер яшчэ вучуся ў аўташколе. Таму зрэдку знаходжу яго для сустрэчы з сябрамі. Праўда, калі ўжо адпачываю, дык і суму на гэта затрачваю немалую. Маю правы.

**— Гуляеш? Калі не сакрэт, колькі складае заробак ахоўніка ў казіно?**

— Мне дастаткова. Гэта інфармацыя не для распаўсюджвання. Скажу толькі, што цяпер я атрымліваю дастаткова грошай, каб забяспечыць малодшага брата ўсім неабходным, а таксама дапамагчы маці.

**— А матуля дзе працуе?**

— Выхавальніцай у дзіцячым садку. Сама разумееш, што атрымлівае яна там не вельмі шмат. І, калі б я не пайшоў з малых гадоў на працу, адна б яна не выцягнула ўсю сям'ю. Таму і давялося дапамагаць. Тата нас пакінуў. У яго цяпер іншая сям'я, іншыя дзеці, жонка. Усё, што мы ад яго атрымліваем, — гэта аліменты, якіх не хапае нават на самае неабходнае.

**— Як маці ставіцца да тваёй працы? Не супраць таго, што ты столькі працуеш?**

— Вядома ж, хвалюецца, але ўсё разумее. Наогул, калі браць узаемаадносіны ў сям'і, то маці разумее, што галоўны я. Яна сама, з самага дзяцінства мяне выхоўвала па прынцыпе, што я — мужчына і павінен весці сябе адпаведна. Усё залежыць ад мяне, ад майго рашэння, якое змяніць магу толькі я. Маці ведае, што калі я рашыў, то буду ісці да канца. Таму і не ўмешваецца ў мае справы.

**— А якія ўзаемаадносіны ў цябе з братам?**

— Нармальныя, шчырыя. Ён мяне слухаецца, паважае маё слова і маю думку. Я ж у сваю чаргу куплю яму ўсё, што толькі яго душа пажадае.

**— Не баішся, што брат сапсуецца з-за тваіх дарагіх падарункаў і мяккіх адносінаў?**

— Не. Я ведаю мяжу. Магу быць мяккім, добрым, але калі нешта не так, дык і цвёрды характар таксама праявіць магу. Гэта мой брат, мой родны чалавек. Я яго люблю і паважаю, і думаю, што ён мяне таксама.

**— А як наконт адносінаў з дзяўчатамі? Ці гатовы ты на сур'ёзны паварот падзей?**

— Згодны, нягледзячы на свой узрост. Па пашпарце я яшчэ малады, нехта скажа, магчыма, што нават і маленькі, але па развіцці даволі дарослы. Магчыма, гэта трэба паставіць у віну майму лёсу. Але гэта не скарга, наадварот, многае бачыў і многае ўмею.

Што спадабалася мне асабіста ў маім суразмоўцу, дык гэта, мабыць, яго прамата і адкрытасць. І для гэтага не патрэбны нейкія асаблівыя праверкі, паколькі ўсё бачна па вачах. Антон — чалавек прамалінейны і ўсе свае думкі ён адкрывае суразмоўцу. Часам гэта спрыяе развіццю і агульнаму ходу падзей, але часам і... Дай Божа, каб кожны з нас ставіўся з такім жа імпэтам не толькі да сваёй працы, але яшчэ і да родных і блізкіх нам лю-дзей, бо без іх мы ў гэтым жыцці як без рук, а некаторыя нават, як і без сэрца.



**У пытаннях сям'і і працы разбіралася студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

## Студэнцкая вёска прыме жыхароў 1 верасня

**Першы інтэрнат студэнцкай вёскі 1 верасня павінен прыняць больш за тысячу студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Узводзіцца ён на праспекце Дзяржынскага паміж карпусамі медуніверсітэта і жылым раёнам Брылевічы.**

Як расказала галоўны архітэктар праекта Галіна Перліна, такіх інтэрнатаў у сталіцы яшчэ не будавалі. Гэта будынак кватэрнага тыпу, у кожным блоку па два пакоі. Адзін плошчай 14 квадратных метраў разлічаны на двух чалавек, другі ў 21 квадратны метр — на трох. У блоку прадугледжаны кухня плошчай больш як 6 квадратных метраў з халадзільнікам і электраплітой, душавая, прыбіральня. У корпусе пяць ліфтаў (у тым ліку грузавы), залы для актыўнага адпачынку, пральня, медпункт, сталовая на 60 месцаў. Акрамя таго, у будынку інтэрната размесціцца невялікая гасцініца для прыезджых — бацькоў і сяброў студэнтаў. Ва ўнутраным дворыку разаб'юць зону адпачынку. Каля інтэрната з'явіцца і невялікая стаянка на 50 машына-месцаў.

**Вольга ЖАРЫНА, «Мінск—Навіны».**

## Канікулы на бальнічным ложку...

**У летні час значна павялічваецца колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей.**

Толькі ў чэрвені мы страцілі на дарозе 4 дзіцяці. Больш як паўсотні дзяцей атрымалі раненні.

Вось толькі два апошнія выпадкі. Першы здарыўся на тэрыторыі Аршанскага раёна. Кіроўца «УАЗа» не прапусціў на нерэгуляваным перакрыжаванні 12-гадовага мапедыста. У выніку наехаў на яго. Хлопчык атрымаў цялесныя пашкоджанні і быў шпіталізаваны. Другое няшчасце адбылося ў Нясвіжскім раёне. Кіроўца «Фальксвагена» быў за рулём без пасведчання і нападпітку. Пры сустрэчным раз'ездзе з аўтамабілем «Аўдзі» наехаў на 3-гадовага хлопчыка, які рухаўся па абочыне разам з маці. З траўмамі дзіця дастаўлена ў хірургічнае аддзяленне мясцовай бальніцы.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Да Дуброўскага і Рымскага-Корсакава

**У Полацкім раёне актывісты БРСМ карпатліва даследуюць будынкі і маёнткі мінулых стагоддзяў, вывучаюць гісторыі іх будаўніцтва. Таксама збіраюць легенды. І ў выніку распрацоўваюць турыстычныя маршруты.**

— У Полацкім райвыканкаме нам даручылі паўдзельнічаць у стварэнні турыстычных маршрутаў, а за лідарамі нашай моладзевай арганізацыі замацавалі канкрэтныя месцы, — расказвае **Яўген ТРУХАНАЎ, першы сакратар Полацкага раённага камітэта БРСМ.** — Такім чынам мы стараемся паспрабаваць сябе ў якасці менеджараў у галіне турызму. Выязджаем у вёскі, пасёлкі, усё аглядаем прама на месцах, гутарым са старажыламі, запісваем іх успаміны.

**ДА МАЙСТРА МАСТАЦКАЙ ВЫШЫЎКІ**

Па дарозе Полацк — Глыбокае мы накіроўваемся ў вёску Фарынава. Гэта цэнтр сельскага Савета, адзін з найбуйнейшых населеных пунктаў усяго раёна. Тут жыве шмат таленавітых людзей.

А ў вёсцы Рудня абавязкова трэба заехаць да майстра мастацкай вышыўкі Вольгі Паўлаўны Каструк. Яе дом вельмі нагадвае выставачную залу музея народнай творчасці. Работы дапамогуць зразумець душу вясковай жанчыны-працаўніцы. Назва пасёлка выклікае цікавасць. Ёсць прыгожая легенда. У імператрыцы Кацярыны II, калі яна праязджала гэтыя мясціны, вецер сарваў галаўны ўбор. І ўсклікнула яна: «Як тут ветрана!»

**ДА ВАЛУНА ВАГОЙ У 16 ТОН**

Усяго за некалькі кіламетраў, у вёсцы Залессе, адразу ўражвае вялікі валун. Яго вага — 16 тон. На валуне металічная таблічка з тэкстам: «Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч 1859—1934. Вядомы дзеяч беларускай культуры, выдавец, фальклярыст, мовавед, літаратуразнавец. Уладальнік сядзібы «Залессе». Такім чынам земляні ўшанавалі памяць прафесара Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, аўтара «Беларускай рукапіснай хрэстаматыі». Уразяць і ваенныя інжынерныя збудаванні часоў мінулай вайны. Ветрынскі апорны пункт Полацкага ўзмацняльнага раёна захаваўся да нашых дзён практычна цэлым. Ён уключае ў сябе 10 трохпавярховых дотаў на 20 артылерыйскіх гармат.

**ЦАРКВУ — ЗА АКІЯН?**

У вёсцы Быкаўшчына былі ўладанні вядомага роду з асабістым гербам Козел-Паклеўскіх. Уладальнік сядзібы Альфонс Фаміч быў чыноўнікам па асобых даручэннях пры генерал-губернатары Табольскай губерні Заходняй Сібіры. Гісторыя роду — цікавыя старонкі гісторыі краю. Яе можна пачуць падчас экскурсіі, якую праводзяць выхаванцы школы-інтэрната, што вось ужо больш за 50 гадоў месціцца ў былой панскай сядзібе. Захаваліся жылы дом, флігель, гаспадарчыя пабудовы, падземная частка склепа роду, парк. Усё гэта знаходзіцца пад аховай дзяржавы.

А ў вёсцы Бяздзедавічы ёсць сядзіба Аляксандра Аляксандравіча Рымскага-Корсакава, сваяка вялікага рускага кампазітара. І сямейная праваслаўная царква захавалася, што была пры маёнтку. Яна — помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя, выканана ў псеўдарускім стылі. Пабудавана з каменя і цэглы. Сёння, пасля рэстаўрацыі, царква зноў дзейнічае. Дарэчы, нейкія амерыканскія энтузіясты пажадалі на поўным сур'ёзе па цагліне разабраць тое, што захавалася да нашых дзён, і перавезці за мяжу.

— Бясспрэчна, трэба аднаўляць маёнткі, — расказвае Яўген Труханаў, — і нашы актывісты гатовыя паўдзельнічаць у гэтым працэсе. Але і тое, што ёсць, можна, у прынцыпе, паказваць турыстам. І хай нямнога, але ўжо зарабляць на гэтым.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У МІНСКУ З'ЯВІЛІСЯ ПЕРШЫЯ ВЕЛАПАРКОЎКІ

**Першыя велапаркоўкі ў сталіцы з'явіліся ў Савецкім раёне. Спецыяльныя пляцоўкі для захоўвання веласіпедаў абсталяваны на вуліцы Гікала непадалёку ад ЦУМа, каля корпуса БДУІР на вуліцы П. Броўкі, крамы «Спорт» на праспекце Незалежнасці, 44.**

У будучыні пры новым будаўніцтве і рэканструкцыі аб'ектаў велапаркоўкі будуць абсталёўвацца ў абавязковым парадку.

Паралельна ў горадзе стане фарміравацца і сетка веладарожак. Згодна з генпланам развіцця Мінска, да 2015 года веладарожкі павінны быць пабудаваныя ва ўсіх ландшафтна-рэкрэацыйных зонах, а таксама ў раёнах масавага жыллёвага будаўніцтва. А да 2030 года плануецца завяршыць фарміраванне веласіпеднай інфраструктуры на тэрыторыі горада і прыгараднага наваколля.

**Вольга ЖАРЫНА, «Мінск—Навіны».**

## «ЗАЛАТЫЯ» ВЫПУСКНІКІ

**На рахунку выпускнікоў сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў 2009 года — 2741 залаты і 698 сярэбраных медалёў. Пра гэта паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Валянціна МАЕЎСКАЯ. У працэнтных суадносінах колькасць выпускнікоў, якія атрымалі вышэйшую школьную ўзнагароду, склала 3,5 працэнта ад агульнай колькасці. Для параўнання: у 2008 годзе з медалямі скончылі школу 2,1 працэнта ад агульнай колькасці выпускнікоў, а ў 2007 годзе — 1,6 працэнта.**

На выхадзе з базавай школы пасведчанні аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай атрымалі сёлета 6087 чалавек. Гэта амаль у тры разы больш, чым у папярэднім годзе, праўда і выпуск з базавай школы сёлета быў большы ўдвая ў сувязі з пераходам да 11-годкі.

Не сакрэт, што пасля таго, як наяўнасць залатога ці сярэбранага медаля перастала гарантаваць іх уладальнікам нейкія перавагі пры паступленні ў ВНУ (толькі пры роўнай колькасці балаў), гэта акалічнасць крыху абясцэніла вышэйшую школьную ўзнагароду. Многія школьнікі вырашылі сканцэнтравацца на паглыбленым вывучэнні профільных для сваёй будучай спецыяльнасці дысцыплін, тым больш што аднолькава здольных і таленавітых ва ўсіх абласцях (і ў гуманітарных, і ў лінгвістычных, і ў прыродазнаўчых) насамрэч не так ужо і многа. Да таго ж і Міністэрствам адукацыі былі вызначаны больш жорсткія крытэрыі да выпускнікоў, якія прэтэндуюць на атрыманне вышэйшай школьнай узнагароды.

У 90-я гады, калі колькасць медалістаў дасягала 11-12 працэнтаў ад агульнай колькасці вучняў выпускных класаў, гучалі шматлікія прэтэнзіі да якасці ведаў, якія школьныя выдатнікі дэманстравалі на ўступных іспытах. І бляск школьных узнагарод стаў паступова гаснуць. Таму і вырашана было браць пад увагу вынікі вучобы ў школе за апошнія чатыры гады. Цяпер залатым медалём узнагароджваюцца выпускнікі ўсіх тыпаў навучальных устаноў, якія маюць пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай, прыкладныя паводзіны і гадавыя і экзаменацыйныя адзнакі за 10 і 11-ы клас 9 і 10 балаў (акрамя фізічнай культуры).

Аднак, нягледзячы на адмену прывілей на ўваходзе ў ВНУ, школьныя выдатнікі ўсё ж такі маюць адну перавагу перад сваімі канкурэнтамі: паколькі сярэдні бал атэстата прыраўноўваецца да чацвёртай экзаменацыйнай адзнакі, у медалістаў ёсць своеасаблівы запас пры падліку агульнай сумы балаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



# ЧАС ХВАЛЮЮЧАГА ЧАКАННЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Ва ўсіх астатніх ВНУ любой формы ўласнасці прыём дакументаў будзе весціся *з 16 па 25 ліпеня* (на ваенных факультэтах — *з 16 па 23 ліпеня*). У Акадэміі МУС, Ваеннай акадэміі, Камандна-інжынерным інстытуце МНС, Гомельскім інжынерным інстытуце МНС уступныя выпрабаванні пройдуць *з 16 па 19 ліпеня*, у творчых ВНУ — *з 14 па 23 ліпеня*, у ВНУ другога патоку (як дзяржаўных, так і прыватных ) — *з 26 па 30 ліпеня*. Залічэнне абітурыентаў у ВНУ «сілавых» ведамстваў на ўсе формы навучання завершыцца *24 ліпеня*, у творчых — *28 ліпеня*, а ў ВНУ другога патоку — *6 жніўня*.

Залічэнне, як абяцаюць у Міністэрстве адукацыі, будзе ажыццяўляцца ў максімальна адкрытым рэжыме, таму што поўная і праўдзівая інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў з'яўляецца сведчаннем празрыстастасці конкурсу. Інфармацыю аб ходзе прыёму дакументаў прыёмныя камісіі абавязаны абнаўляць не радзей, чым адзін раз у тры гадзіны, на інфармацыйных стэндах, электронных табло, а таксама на сайтах навучальных устаноў у інтэрнэце. Інфармацыйныя стэнды павінны размяшчацца ў даступных месцах, а інфармацыя — чытацца з вялікай адлегласці.

І ўсё ж такі хацелася б параіць абітурыентам не адкладваць свой візіт у прыёмную камісію на апошні дзень, таму што такіх «разумнікаў» можа быць шмат, і сітуацыя з конкурсам можа змяніцца літаральна за некалькі апошніх гадзін ці нават ужо пасля закрыцця прыёмных камісій — уся справа ў тым, што прыёмныя камісіі абавязаны прыняць дакументы ва ўсіх, хто ўвойдзе ў будынак ВНУ да 18 гадзін. Гэта праблема апошняга дня падачы дакументаў паўтараецца з года ў год, нягледзячы на ўсе спробы і папярэджанні...

У БНТУ, напрыклад, летась 23 ліпеня былі пабіты ўсе рэкорды папярэдніх гадоў: у апошні дзень падачы дакументаў тут было прынята 3890 (!) заяў. А наогул у БНТУ прынялі ў 2008 годзе 9618 заяў ад 8289 абітурыентаў. Такім чынам, больш як 1300 чалавек падавалі дакументы спачатку на адну спецыяльнасць, а потым мянялі сваё рашэнне і перападавалі іх на іншую. Жаданне абітурыентаў стаць студэнтам любой цаной цалкам зразумелае. Але практыка паказвае, што перападаюць свае дакументы пераважна тыя, чый бал знаходзіцца на мяжы прахаднога. А ў такім выпадку ўгадаць, на жаль, вельмі складана. Застаецца толькі спадзявацца на ўдачу, але многія памыляюцца са сваімі падлікамі. У прыёмных камісіях з жалем канстатуюць, што абітурыенты ўсё часцей выбіраюць не будучую прафесію, а арыентуюцца на прахадны бал і нават не могуць сфармуляваць свае жаданні. Па мабільных тэлефонах яны звязваюцца з бацькамі і раяцца, як выбраць найбольш прыдатную спецыяльнасць і паступіць пры гэтым на бюджэт. Не ўсе ўлічваюць стан свайго здароўя. Калі для гуманітарных спецыяльнасцяў медыцынскіх супрацьпаказанняў практычна няма, то, напрыклад, з алергіяй, астмай, захворваннямі нырак супрацьпаказана работа ў хімічнай прамысловасці, фармацэўтыцы, сельскай гаспадарцы, на экалагічных спецыяльнасцях. З высокай ступенню блізарукасці паказаны прафесіі, не звязаныя з фізічным напружаннем, вібрацыяй, частымі і працяглымі нахіленнямі галавы, з сістэматычнымі зрокавымі нагрузкамі. Пры дальназоркасці сярэдняй і высокай ступені супрацьпаказаны работы, якія патрабуюць сістэматычнага напружання зроку, напрыклад, дакладныя работы з дробнымі дэталямі, а пры праблемах з маўленнем — работа, якая патрабуе пастаянных стасункаў з людзьмі.

**Новыя спецыяльнасці, на якія будзе ажыццяўляцца набор у 2009 годзе:**
***«Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы ў электроніцы» (БДУІР)***
***«Транспартная лагістыка», «Тэхналогія і абсталяванне тарфяной вытворчасці», «Мікра- і нанатэхніка», «Камп'ютарная мехатроніка» (БНТУ).***
***«Турызм і прыродакарыстанне» (Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверстіэт).***
***«Ветэрынарная фармацыя», «Ветэрынарная санітарыя і экспертыза» (Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны).***
***Таксама некаторыя сталічныя і рэгіянальныя ВНУ атрымалі дазвол на адкрыццё падрыхтоўкі па такіх запатрабаваных заказчыкамі спецыяльнасцях, як «Лагістыка» і «Турызм і гасціннасць».***


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Зразумела, што пры звароце абітурыента ў прыёмную камісію вельмі шмат будзе залежаць ад прафесіяналізму яе членаў, іх здольнасці вырашаць канфліктныя сітуацыі, даваць слушныя і вычарпальныя кансультацыі і адказы. Многіх абітурыентаў часта цікавіць, якім чынам арганізуецца асобны конкурс для сельскай моладзі. Усё даволі проста: на месцы, вызначаныя кантрольнымі лічбамі прыёму (без уліку лічбаў прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі), залічваюцца асобы, якія маюць ільготы на залічэнне без уступных іспытаў і па-за конкурсам, а тыя месцы, што засталіся, дзеляцца прапарцыянальна пададзеным заявам сярод дзвюх катэгорый абітурыентаў: сельскіх і гарадскіх.

Спісы залічаных, у сваю чаргу, павінны ўтрымліваць інфармацыю аб колькасці набраных балаў і льготным залічэнні (без уступных іспытаў і па-за конкурсам), каб у абітурыентаў і іх бацькоў не ўзнікала нават думкі аб магчымасці супрацьпраўных дзеянняў членаў прыёмнай камісіі.

Магчыма, кагосьці з абітурыентаў, якім не пашанцуе пры паступленні, падбадзёрыць прыклад абітурыентаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта — *летась сярод залічаных на першы курс гэтай ВНУ былі маладыя людзі, якія паступілі з трэцяй, чацвёртай і нават з пятай спробы*. А такая мэтанакіраванасць, пагадзіцеся, не можа не выклікаць павагу. Адным словам, ні пуху ўсім, ні пер'я...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Студэнцкая эканоміка

# Як я траціла тры тысячы...

Як патраціць 3 000 рублёў? — Студэнт без праблем знойдзе спосаб іх ужыць і пусціць у ход тры сінія купюры.

Але што рабіць, калі гэтыя 3 000 — АПОШНІЯ?!

Зараз у маім кашальку якраз такая сітуацыя. Акурат тры тысячы. Захавальнік маіх зберажэнняў сёння не тоўсты ад чэкаў і двацацірублёвак.

Як найбольш выгадна і эфектыўна студэнту патраціць гэтыя грошы? Па адказ на гэтае пытанне я пайшла ў крамы.



## Аддзел касметыкі

Адзінае, што я адшукала сярод шкляных бліскучых вітрынаў па сваіх «трохтысячных магчымасцях» — гігіенічная памада. Такая рэч аднолькава падыходзіць і хлопцам, і дзяўчатам. Але ці не з'ем я яе з голаду, калі не куплю ежы? Разважаю каля прылаўка і разумею, што гэта не самая лепшая пакупка на апошнія грошы.

А таму — ідзём далей...

## Аптэка

Самыя любімыя лекі студэнтаў — вітаміны. Дакладней, аскарбінка. Маленькімі жоўтымі шарыкамі студэнты лечаць усё — ад горла да страўніка. Таму што, у асноўным, іншых лекаў у студэнцкай аптэцы, лічы, проста няма. Бо каштуюць яны значна даражэй. А вось аскарбінку студэнты любяць і паважаюць. І за смак, і за цану. На рэшту з 3 000 хопіць яшчэ і на пачак салодкай глюкозы, яшчэ адной таннай падпіткі для мозгу перад сесіяй.

## Mc Donalds

Чарговая панацэя для студэнта. Хутка і адносна нядорага. Ды і атмасфера даволі моладзевая. З нашым бюджэтам не будзем спакушацца на двайныя бутэрброды з курынымі катлетамі і плаўленым сырам, а задаволімся толькі **гамбургерам**. Тады будзе шанец яшчэ паласавацца **марожаным**.

## Піва

Ну а куды ж без яго? За бутэлькай піва можна пасядзець з сябрамі, душэўна пагаварыць, між іншым расказаць і пра свае грашовыя праблемы... Ёсць верагоднасць, што выйсце знойдзецца: напэўна, хто-небудзь з таварышаў падкажа табе, дзе ёсць магчымасць папрацаваць увечары ці ў выхадныя! Шанцы падвояцца, калі сам пачастуеш сябра півам. Калі ты не гурман, то на 3 000 выйдзе акурат 2 паўлітровыя бутэлькі. Калі ж ты за якасць, а не за колькасць, набывай адну бутэльку. Застанецца і на пачак арэшкаў.

Хоць насамрэч з півам праблем не зменшыцца. А праз гадзіну пасля задушэўнай размовы радасць выветрыцца, а страўнік пачне падаваць гаспадару сігналы, што хоча есці... Карацей, ты зразумееш, што праблем стала яшчэ больш, а трох тысяч — як не было!

Таму ідзём па крамах далей.

## «Канцыляршчына»

Тое, чаго заўсёды не хапае студэнту. Канцылярскіх дробязяў, здаецца, і шмат, але пад рукой ніколі няма! То згубіш дзе, то дома пакінеш. Таму — своечасова папаўняем запасы!

Мы не будзем выбіраць шматфункцыянальныя стэплеры і блакноты ў вокладках. Абмяжуемся блокам аркушыкаў для нататак (ох як спатрэбяцца на шпаргалкі да залікаў і экзаменаў!), парай шарыкавых ручак, звычайным алоўкам і гумкай, якая сцірае ручку.

## Пошта

Стартавага капіталу ў 3 000 хопіць на тое, каб праз некалькі дзён у вас стала грошай у разы болей. Проста набываеце канверт і паштоўку, пішаце штонебудзь кшталту: «Маме, тату прывітанне! У мяне ўсё добра. Толькі... зноў скончыліся грошы. Вышліце яшчэ. Цалую, Віка». Пасля няцяжкай працэдуры адпраўляеце сваё душэўнае пасланне бацькам дадому. І праз 3-4 дні — о цуд! — у вашай паштовай скрыні — запаветная квітанцыя на перавод. Але... тут ёсць дзясяткі сваіх «але». Згадзіцеся, гэта не самы лепшы спосаб узбагаціць свае грашовыя запасы. Падумайце пра бацькоў: яны ж і так выбіваюцца з сіл, каб мы ні ў чым не адчувалі патрэбы. А на мінулых выхадных, калі вы былі дома, як бы выпадкова далі на дарогу і дробныя выдаткі пяцьдзесят тысяч. Прасіць яшчэ? Сорамна. І ўявіце, у чым ім давядзецца адмовіць сабе, каб праз два дні іх дзіця ў сталіцы было пры грошах...

Усё, вырашана: выходжу з пошты. Якія ў нас засталіся крамы?

## Белтэлекам

Яшчэ адна шыльда магнітам цягне да сябе. За гэтымі дзвярыма мы пакідаем не адну тысячу ў тыдзень. Менавіта тут мы стаім у чэргах і бясконца кладзём грошы на тэлефон. Калі развітацца на «Белтэлекаме» з трыма тысячамі, то, у залежнасці ад тарыфу, у вас будзе ад 10 да 70 хвілін размоваў з сябрамі!

## Царква

З набліжэннем сесіі вера студэнтаў расце проста ў геаметрычнай прагрэсіі! На стале сярод канспектаў і ў кішэні побач са шпаргалкамі сустракаюцца абразкі з тваім нябесным апекуном. Усё часцей узгадваеш вывучаныя з дзяцінства малітвы. А потым і ўвогуле ідзеш у царкву. Трох тысяч у кашальку будзе дастаткова. Паставіце свечку на паспяховую вучобу і за здароўе. І выйдзеце з царквы з лёгкасцю. Без грошай, але са спакойнай душой.

## Рынак

Калі вы за колькасць і за якасць адначасова, і да таго ж клапоціцеся пра сваё здароўе — з трыма тысячамі ў кашальку смела ідзіце на рынак. На гэтую суму супраць 150 грамаў каўбасы можна ўзважыць цэлыя 2 кілаграмы капусты! Яе будзеце есці некалькі дзён. Таксама можна набыць на выбар кіло яблыкаў, агуркоў ці памідораў. «Плюсы»: здаровы лад жыцця і вялікія аб'ёмы набытага. «Мінусы»: да рынку трэба ж яшчэ даехаць! А гэта яшчэ мінус 1200 ад нашага сціплага бюджэту.

## «Белсаюздрук»

Дарэчы, пра праезд у грамадскім транспарце. Яшчэ адзін, на мой погляд, разумны шлях развітацца з апошнім — набыць талоны ці жэтоны на метро. Застаняцеся без грошай, затое спакойна будзеце ездзіць і не глядзець з заміраннем душы на чарговы прыпынак: а раптам кантралёры? Праўда, выйдзе на 3 000 усяго пяць.

Існуюць яшчэ дзясяткі спосабаў патраціць 3 000. Асабліва апошнія 3 000. Сярод астатніх шляхоў развітання з грашыма вылучаецца дзіўная група — дабрачыннасць. Аддаць апошняе суседу-«платніку», які не атрымлівае стыпендыі, пакласці гітарысту ў пераходзе ці ў кулак згорбленай бабулі каля крамы — падвіды студэнцкай дабрачыннасці. Да такога спосабу звяртаюцца ў вельмі рэдкіх выпадках. Часцей за ўсё студэнты здзяйсняюць такія ўчынкі пад уражаннем ад фільма, пасля сваркі з каханым ці ў стане афекту. Азірнуўшыся, як правіла, шкадуюць аб зробленым. Але... позна.

На тое мы і студэнты, каб рабіць неабдуманыя ўчынкі.

Зараз модна пісаць пра крызіс. З нагоды і без яе. Нягледзячы на тое, што гэты артыкул пра грошы (дакладней, пра іх недахоп), я свядома не ўжывала слова «крызіс» ні разу. Таму што да студэнтаў сусветны фінансавы крызіс не мае дачынення. У студэнтаў і без яго — вечны крызіс на працягу пяці гадоў вучобы...

Што?! У маім кашальку тры тысячы?!

Якое шчасце...

**Вікторыя ЦЕРАШОНАК.**

# І СЛОВА, І СПРАВА

## Інтэрнэт-парталу «Моладзь Міншчыны» — год

**Стварыць сайт, які будзе несці толькі карысную, важную, цікавую інфармацыю для маладых людзей. Менавіта такую задачу паставілі перад сабой у Мінскім абласным камітэце БРСМ год таму. Ад слоў адразу прыступілі да справы. У выніку за кароткі перыяд стваральнікам інтэрнэт-партала «Моладзь Міншчыны» ўдалося дабіцца нямалых вынікаў. Пра глабальны інтэрнэт-рэсурс, творчыя планы, сакрэты поспеху нашаму карэспандэнту расказаў каардынатар праекта Павел СЫРЫЦКІ.**

— Мы рыхтуем да юбілейнай даты шэраг мерапрыемстваў, такіх, як он-лайн канферэнцыі з цікавымі асобамі, дабрачынны праект «Рух-HELP», прэзентацыю моладзевага турыстычнага маршруту «7 цудаў прыроды Міншчыны». За год працы наш інтэрнэт-рэсурс пазітыўна зарэкамендаваў сябе ў беларускай сетцы інтэрнэту.

**— Што такое моладзевы партал «Моладзь Міншчыны»?**

— У структуру партала ўваходзяць 194 інтэрнэт-рэсурсы моладзевай тэматыкі Мінскай вобласці і краіны. З іх 18 уласных сайтаў Мінскай абласной арганізацыі БРСМ, 7 спецыяльных праектаў. На мясцовым узроўні найбольш цікавыя праекты рэалізавалі Любанскі, Клецкі, Мінскі, Смалявіцкі, Нясвіжскі раённыя камітэты.

**— Цікава, колькі наведвальнікаў пабывалі на вашым сайце?**

— Зараз у нас зарэгістравана 489 000 наведванняў. Для нас гэтая лічба знакавая. Вельмі прыемны той факт, што сярод гасцей сайта ёсць і жыхары з Беларусі, Расіі, Германіі, Украіны, ЗША. Гэта заканамерна, бо там жывуць вялікія беларускія дыяспары.

**— У чым сакрэт прызнання і папулярнасць сайта сярод аўдыторыі моладзі?**

— Папулярнасць інтэрнэт-партала тлумачыцца перш за ўсё вялізнай працай, якую праводзіць моладзевы актыў Мінскай вобласці па ўвядзенні сучасных інфармацыйных тэхналогій у працу арганізацыі. Унікальнасць праекта ў стварэнні адзінага ў беларускім сегменце сеткі інтэрнэт раздзела навінаў «Моладзевы мерыдыян», які асвятляе ўсе пытанні моладзі Беларусі — адукацыі, будаўніцтва жылля, здароўя, дзяржаўнай моладзевай палітыкі, сусветных тэндэнцый. На сайце можна даведацца пра дзейнасць моладзевай арганізацыі Мінскай вобласці, пазнаёміцца з вакансіямі ў студэнцкіх атрадах, з дысконтнай сістэмай зніжак, прафілактыкай правапарушэнняў.

Атрымалі прызнанне ў хлопцаў і дзяўчат Міншчыны спецыяльныя праекты, якіх было рэалізавана восем: «Моладзевая дошка гонару», «Віртуальны музей камсамола Міншчыны», «7 цудаў прыроды Міншчыны», «Я шукаю цябе, мама!», «Рух- HELP», «Разговор On-Line». У апошнім праекце, дарэчы, узялі ўдзел Георгій Калдун, Ганна Шаркунова, Люся Лушчык, гурт «Street Masters», Міхаіл Грабоўскі і іншыя.

Па выніках «7 цудаў прыроды Міншчыны» ў найбліжэйшы час адбудзецца прэзентацыя моладзевага турыстычнага маршруту, які пройдзе па тэрыторыі Вілейскага і Мядзельскага раёнаў. Акрамя таго, на нашым сайце створаны шырокія магчымасці On-Line кансультавання моладзі па пытаннях занятасці, жылля, уступнай кампаніі і іншым кірункам.

**Гутарыла Аксана КОЗІНАВА.**

Тэлесеткі

# ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

## У пошуках новага вядучага на АНТ прагледзелі некалькі дзясяткаў кандыдатаў

У «Нашай раніцы» на АНТ адбылася замена: замест Сяргея Дарафеева ў ранішнім эфіры з'явіўся спявак Герман Цітоў (ён жа Дзмітрый Карпінчык). Сам жа Сяргей цяпер з'яўляецца кіраўніком дырэкцыі ранішняга вяшчання, а таксама адначасова кіраўніком і вядучым праграмы «Выбар».

Пошукі новага вядучага-мужчыны, як расказалі ў прэс-службе тэлеканала, пачаліся больш як два месяцы таму, а на кастынг прыйшлі амаль чатыры дзясяткі прэтэндэнтаў. Яно і зразумела: ранішняя праграма мае самыя высокія рэйтынгі, таму быць яе вядучым — гэта не толькі вялікая папулярнасць, але і роўная ёй адказнасць.





**Герман Цітоў** на адбор прыйшоў не з вуліцы, а па запрашэнні, але конкурс яму давялося праходзіць на агульных падставах — прачытаць тэкст з суфлёра, падтрымаць дыялог з гасцямі праграмы (ролю «госця» на кастынгу выконваў Сяргей Дарафееў). І хоць вопыту работы на камеру ў спевака хапала, усё ж не абышлося без карэктыў і заўваг:

— Асноўныя заўвагі датычыліся арфаэпіі. Я раней не звяртаў увагі на правільнае вымаўленне, націск у тых ці іншых словах — а тут давялося над гэтым папрацаваць, перапісвалі некалькі дубляў. За вынік я, шчыра прызнацца, вельмі перажываў — але, паглядзеўшы на сябе на экране, у цэлым застаўся задаволены. Хоць, безумоўна, шмат над чым трэба яшчэ працаваць, усё ж я не прафесіянал у гэтай справе.

**— 40 чалавек на адно месца — гэта надзвычай вялікі конкурс. Што вы шукалі ў кандыдатах і ці ўдалося гэта знайсці?** — цікаўлюся ў **Сяргея Дарафеева.**

— Шукаў не толькі я, канчатковае рашэнне прымала кіраўніцтва канала, якое зацвярджала кандыдатуру вядучага. А знайсці хацелася лёгкасць, натуральную прадстаўнічасць чалавека, каб ён штосьці ўяўляў з сябе як асоба, а не пацвярджаў сваю значнасць, надзімаючы шчокі і не глядзеўся ў камеру, як у люстэрка. Зразумела, улічваліся і фотагенічнасць, і ўменне трымацца перад камерай, і правільнае маўленне — мноства крытэрыяў. Не ўсім гэтым пунктам адпавядаў Герман, але большасці з іх — адпавядаў. Па астатніх будзем працаваць, і думаю, што неўзабаве ўсе заўважаць прагрэс і рост Германа як тэлевядучага.

**— Нават па першых эфірах некаторыя заўважылі, што вы з Германам падобныя вонкава, па тыпажы...**

— Думаю, што гэта атрымалася хутчэй выпадкова.

**— Ці чакаць з вашым прызначэннем на пасаду кіраўніка пераменаў у ранішнім вяшчанні — новых рубрык, новых праграм — або ўсе сюрпрызы прыберагаеце да новага сезона?**

— Я не прыхільнік таго, каб секчы наводмаш і ў гарачцы. Ёсць пэўныя прынцыпы, па якіх будуецца вяшчанне канала, схемы работы і правілы, паводле якіх мы выдаём у эфір новыя прадукты, новыя ідэі. Абнаўленні, натуральна, будуць — мы цяпер над гэтым працуем. Гледачы звычайна лічаць, што на лета ўсе праграмы на тэлебачанні сыходзяць у водпуск, а на пачатку сезона з'яўляюцца ўсякія прыгожыя і цікавыя навінкі; але, каб яны з'явіліся, летам трэба папрацаваць як след, 24 гадзіны ў суткі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Ведай нашых!

# Хочаш у Францыю? Вывучай матэматыку...

**Беларуская каманда, у якую ўвайшлі навучэнцы сталічнай сярэдняй школы № 41 і Ліцэя БДУ, падзяліла першае месца з камандай французскіх школьнікаў «Францыя-2» на першым Міжнародным турніры юных матэматыкаў.**

Беларускую каманду да гэтых спаборніцтваў рыхтавалі выкладчыкі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Турнір прайшоў на базе вядомага ўніверсітэта Парыж-Сюд 11 (ParisSud 11), які сумесна з Белдзяржуніверсітэтам выступіў ініцыятарам і арганізатарам турніру. Папярэднія заяўкі на турнір падалі каманды з Германіі, Бразіліі, Балгарыі, Расіі, Марока, Францыі і Беларусі. Цікавая і складаная барацьба прывяла да таго, што ў фінале сустрэліся дзве каманды з Францыі («Францыя-1» і «Францыя- 2»), каманды з Беларусі і Балгарыі.

Турнір матэматыкаў — гэта камандныя спаборніцтвы навучэнцаў сярэдніх школ па ўменні рашаць складаныя матэматычныя задачы, кампетэнтна і пераканаўча тлумачыць атрыманыя вынікі, аргументавана адстойваць свой пункт погляду ў публічных дыскусіях. Ён праходзіць у выглядзе матэматычных баёў, у якіх каманды па чарзе агучваюць свае даследаванні па прапанаваных заданнях, а таксама выступаюць у ролі апанентаў, рэцэнзентаў і ўдзельнікаў дыскусіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АЎТАСТОП,

## або Новыя ўражанні ад старых іс цін

**Далёкая дарога... Для адных людзей — гэта знак жыцця, для іншых — ненавісная перашкода. Пакуль першыя будуць казаць пра рамантыку аўтастопу, іншыя збіраюць статыстычныя звесткі аб смерцях на дарогах. У гэтых крайнасцях складана знайсці ісціну. Аднак, на мой погляд, падарожжа аўтастопам — гэта прамы выклік самому сабе і праверка на ўстойлівасць сваіх поглядаў на жыццё, бо ў такім выпадку вы павінны навучыцца давяраць іншым. Далей пагаворым пра асаблівасці аўтастопу.**

Дакладнай даты зараджэння аўтастопу не існуе ў прынцыпе; аднак у 50-я гады мінулага стагоддзя ён атрымаў «шырокае распаўсюджанне» на дарогах Злучаных Штатаў дзякуючы «хіпі». Пасля, менавіта «хіпоўскія атрыбуты» — адсутнасць грошай і знаёмства з новымі людзьмі, — вызначылі галоўныя прынцыпы аўтастопу (на жаль, некаторыя з вадзіцеляў адыходзяць ад першага прынцыпу, просячы грошы за праезд). У нашы ж дні людзі, якія «галасуюць» на трасах, з'ява настолькі ж звыклая, наколькі і самі аўтамабілісты. Аўтастоп нават пачалі называць «экстрэмальным спортам» і праводзіць свайго роду «чэмпіянаты свету», калі адважны вандроўнік за пару месяцаў аб'язджае ўвесь зямны шар, выкарыстоўваючы на сваім шляху і аўтамабілі, і караблі, і нават самалёты. У звычайнага ж «стопера» на нашых дарогах узровень адрэналіну ў паездцы цалкам падобны да ўражанняў ад гульні ў «рускую рулетку», бо і аўтамабілісты таксама бываюць небяспечныя, ды і машыну часам прыходзіцца «лавіць» гадзінамі ці нават днямі.

Аўтастоп, у залежнасці ад геаграфічнага становішча, бывае знешнім і ўнутраным. Унутраны характэрны для вандравання па тэрыторыі адной краіны, а знешні — гэта, адпаведна, паездка за мяжу роднай дзяржавы. Пры паездцы за мяжу неабходна не толькі наяўнасць візы і базавае валоданне мясцовай мовай, але і веды законаў іншай дзяржавы, бо, напрыклад, аўтастоп афіцыйна забаронены ў шматлікіх штатах ЗША і на некаторых трасах Еўропы. Таму «стоперу»-пачаткоўцу лепш спыніцца на першым варыянце. Асноўныя парады, якія даводзіцца звычайна чуць ад «бывалых», у асноўным датычацца пытанняў бяспекі. Так, у прыватнасці, калі падарожнічаеш адзін, ні ў якім разе нельга засынаць у машыне або слухаць плэер, свае рэчы трэба заўсёды трымаць пад рукой і сесці па магчымасці на пярэдняе сядзенне (заднія дзверы можна заблакаваць). Нельга падсаджвацца ў машыну да некалькіх людзей, асабліва калі выглядаюць яны даволі падазрона. Значна бяспечней будзе падарожнічаць удваіх, але ў гэтым выпадку будзе складаней «злавіць» спадарожную машыну, бо не кожны аўтамабіліст вырашыцца падсадзіць да сябе ў машыну двух незнаёмых людзей, асабліва калі яны абодва хлопцы. Шырока распаўсюджана меркаванне, што ідэальным спалучэннем бяспекі і эфектыўнасці пры падарожжы аўтастопам будзе пара хлопец+дзяўчына, бо адным дзяўчатам, па зразумелых прычынах, падарожнічаць вельмі небяспечна. З астатніх карысных парадаў адзначу неабходнасць наяўнасці флікера і аптэчкі, у якой бы знаходзіліся прадметы першай медыцынскай дапамогі (бінт, ёд і інш.), а таксама геаграфічную карту мясцовасці, па якой вы падарожнічаеце. Не лішнім будзе запасціся цёплым адзеннем або спальным мяшком, на той выпадак, калі прыйдзецца заначаваць у чыстым полі.

Этыкет аўтастопу ўключае ў сябе два асноўныя правілы. Па-першае, калі вы патрапілі на трасу, на якой недалёка ад вас ужо знаходзяцца «стоперы», то вы павінны «галасаваць» толькі прайшоўшы крыху наперад па шашы, бо вашы апаненты ў такім выпадку маюць большае права паехаць раней за вас. Па-другое, нельга забываць, што аўтастоп — гэта не проста «дабрачыннасць» з боку вадзіцеля, гэта цалкам узаемавыгадны абмен, калі праз стасункі з пасажырам разбураецца перманентны і аднастайны рытм дарогі, і побач ёсць чалавек, з якім можна проста пагаварыць. Таму не трэба панура маўчаць, аднаскладова адказваючы на пытанні вадзіцеля, які спрабуе завесці гутарку, лепш задавайце іх самі! Дарэчы, на асабістым вопыце я пераканаўся, што слухаць даводзіцца куды часцей, чым распавядаць самому.

Кожны «аўтаспыннік» па сваёй сутнасці — поўны аптыміст. Такі чалавек ніколі не павінен падаць духам, бо ён прымае навакольны свет такім, які ёсць, ён дзеліцца з блізкім усім, што мае, ён верыць людзям і адчынены кожнаму. Менавіта таму аўтастоп — гэта не проста адзін з варыянтаў вандравання, гэта спроба зрабіць наш свет больш гарманічным, бо ўзаемны давер выпадковага пасажыра і вадзіцеля — нейкая загадкавая таямніца, якая ўсяляе ў сэрцы людзей трывалую надзею на блізкага і цвёрдае жаданне дапамагаць адно другому.

**Аляксандр ПАЛУБІНСКІ.**

Хочаце — верце

# ЁСЦЬ НАГОДА... НАПІСАЦЬ ЗАВЯШЧАННЕ, альбо ПРА ВУЛКАНІЧНЫ ПАТОП І ПЛАНЕТАРНЫ ШАШЛЫК

Днямі ў аўтобусе два мужчыны абмяркоўвалі надвор'е. Узгадалі працяглыя ліўні са шквалістым ветрам, ураганы, якія цяпер з'яўляюцца ў Беларусі ледзь не кожны год, холад, спёку, рэзкія перапады тэмпературы, суміравалі свае назіранні і прыйшлі да высновы, што не за гарамі канец свету. Як ні круці, а нябесная канцылярыя ўжо стамілася пасылаць чалавецтву апошнія папярэджанні.

Нечаканыя катастрофы планетарнага маштабу, якія пагражаюць знішчэннем усяму жывому на Зямлі, — любімая тэма галівудскіх (і не толькі) кінематаграфістаў. То сонца ўзарвецца, то зямная вось зменіць ухіл, то астэроід з разгону шмякнецца. А яшчэ ж ёсць тэрарысты, Гадзілы, агрэсіўныя захопнікі-іншапланецяне і г.д. У сусветным павуцінні змешчаны рэйтынг самых верагодных (?) прагнозаў канца свету, з пункту гледжання навукі. Першым пунктам там пазначана **гама-выпраменьванне**. Калі дзве блізка размешчаныя зоркі ў стане калапсу сальюцца, адбудзецца жудасны выкід жорсткага патоку гама-часцінак. Усяго дзесяць секундаў спатрэбіцца яму на тое, каб разбурыць азонавы слой і «закіпяціць» аксіды азоту, якія ўтрымліваюцца ў атмасферы. Сонечная радыяцыя здолее без перашкод дасягаць паверхні Зямлі. Гэта прывядзе да распаўсюджвання захворвання на рак скуры і хваробаў вачэй (ад апёкаў сятчаткі да катаракты), а таксама да хуткага вымірання жывёл з маленькім аб'ёмам лёгкіх (ім не будзе хапаць кіслароду ў атмасферы).

**Чорная дзірка** ў рэйтынгу верагодных катастроф займае другую прыступку. Як сцвярджаюць складальнікі рэйтынгу, масіўная чорная дзірка калі-небудзь дасягне нашага сектара галактыкі і зможа зрабіць гравітацыйны ўплыў на Сонца. Наша зорка пачне раз за разам мяняць сваё месцазнаходжанне, што абумовіць бясконцыя змяненні клімату на Зямлі. Пры самым горшым раскладзе нашу блакітную планету можа проста выкінуць са звыклай арбіты за межы Сонечнай сістэмы ў адвечную касмічную зіму.

Сцэнарый нумар тры — **хістанні магнітнага поля Зямлі**. Напрамак электрамагнітнага поля нашай планеты пастаянна змяняецца, сцвярджаюць складальнікі рэйтынгу, з непастаянным перыядам 250 тысяч гадоў і больш. Апошні раз такое пераключэнне адбылося 780 тысяч гадоў таму. Наступнага «скоку» можна чакаць у любы момант. Апроч таго, магнітнае поле Зямлі паступова становіцца ўсё больш слабым: за апошнія 100 гадоў яго магутнасць паменшылася на 5 працэнтаў. Калі падобная тэндэнцыя захаваецца, мноства жывых істот страціць здольнасць арыентавацца ў прасторы, стане лёгкай здабычай для драпежнікаў, пачне наведвацца ў гарады. Разбурацца выверaныя тысячагоддзямі харчовыя ланцужкі, парушацца экасістэмы.

Чацвёрты пункт вынікае з папярэдняга і значыцца ў спісе як **планетарны шашлык**. Калі з цягам часу магнітнае поле Зямлі знікне, іонныя штормы, якія пакуль лютуюць далёка за межамі нашай планеты, дасягнуць яе. Гэта будзе хуткая смерць усяго жывога — усё за лічаныя секундыператварыцца ў попел.

Пятая версія прадказвае нам **вулканічны патоп**. Хоць сейсмічная актыўнасць унутры кары Зямлі паступова затухае, часам адбываюцца рэзкія ўсплёскі вулканічнай дзейнасці. Масавы выкід базальту, лавы і вулканічнага попелу можа прывесці да таго, што аблокі пылу зацягнуць неба, закрыюць Сонца і выклікаюць рэзкае паніжэнне тэмпературы. У якасці «бонуса» да такога сцэнарыя аўтары рэйтынгу абяцаюць кіслотныя дажджы, абумоўленыя багатым утрыманнем серы ў атмасферы.

Пачэсную шостую прыступку ў спісе прычын верагодных катастроф займае маленькае насякомае — **саранча**. Яна лічыцца адной з жывых істот Зямлі, якія муціруюць хутчэй за іншых. Здольнасць саранчы да выжывання ўзрастае ад пакалення да пакалення. Раней ці пазней саранча будзе валодаць абсалютным імунітэтам да ўсіх пестыцыдаў і зможа есці любыя расліны. Сюды ж аўтары занеслі і **бактэрый**, якія па хуткасці мутацый — другія ў спісе пасля саранчы.

Пагрозай нумар сем можа лічыцца **сам чалавек**, дакладней вынікі яго навуковых даследаванняў. Напрыклад, нанаробаты. Фантасты апісвалі іх як скапленне бясконцай колькасці нябачных простым вокам запраграмаваных машын, якія маюць здольнасць да самааднаўлення і прызначаны для перапрацоўкі любых відаў адходаў. Калі такія малюткі аднойчы выйдуць з-пад кантролю, на перапрацоўку трапіць уся арганіка і неарганіка. У тым ліку і мы.

Яшчэ аўтары рэйтынгу прагназуюць нам праблемы з нашым **Сонцам**. Маўляў, яшчэ якіх-небудзь 5 млрд гадоў і Сонца пяройдзе ў фазу «чырвонага гіганта», а адтуль рукой падаць да звышновай. Не палохайцеся — мы гэтага не пабачым, бо ў працэсе пашырэння Сонца пачне паглынаць бліжэйшыя планеты Сонечнай сістэмы. Паводле іншай версіі, наша зорка скіне абалонку і ператворыцца ў белага карліка, але гэта таксама нас не парадуе, бо наступствы будуць самымі сумнымі.

Цікавай і «незаезджанай» можна лічыць версію **сутыкнення нашай галактыкі з галактыкай Андрамеды**, якога можна чакаць праз 4 млрд гадоў. Верагодных сцэнарыяў далейшага развіцця падзей два — альбо нашу Сонечную сістэму выкіне ў пустэчу пазагалактычнай зоны, альбо яе паглынуць звышмасіўныя чорныя дзіркі галактык, якія набліжаюцца.

...Як казала адна знаёмая: «Паніка тут не да месца. Прапаную істэрыку». А мо ўсё ж абыдзецца? Пажывём — пабачым.

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**

**У суседзяў**

# Былы прэзідэнт у ролі «першага мужа» пані Іолі?

**Сёння ў Польшчы закручваецца інтрыга вакол маючай адбыцца чарговай прэзідэнцкай выбарнай кампаніі. Адным з яе самых цікавых персанажаў мае шанцы стаць Іяланта Квасьнеўская — жонка былога прэзідэнта Аляксандра Квасьнеўскага.**

Цяпер у краіне многія задаліся пытаннем: ці ўселіцца ён паўторна пасля пяцігадовага перапынку ў прэзідэнцкі палац? Не выключана. Аднак вярнуўся б ён туды ў незвычайнай для сябе ролі «першага мужа». Папулярная газета «Жечпосполіта» сумесна з адной вядомай сацыялагічнай кампаніяй Польшчы правяла сацапытанне з мэтай выявіць шанцы розных кандыдатаў на перамогу ў прэзідэнцкіх выбарах, якія адбудуцца ў наступным годзе. З апытання выцякае, што жонка Квасьнеўскага Іяланта магла б разлічваць на істотную падтрымку насельніцтва на выбарах кіраўніка дзяржавы. За былую першую лэдзі, калі б яна ў другім туры змагалася з цяперашнім прэм'ер-міністрам Дональдам Тускам (ён пакуль з'яўляецца безумоўным лідарам у гонцы на прэзідэнцкае крэсла), гатовыя аддаць галасы цэлых 47 працэнтаў апытаных. Такім чынам яна стала б самым сур'ёзным супернікам прэм'ер-міністра. Па словах лідара Саюза левых дэмакратаў Гжэгажа Наперальскага, хутчэй за ўсё, гутарка на гэтую тэму са спадарыняй Іялантай адбудзецца і пытанне аб магчымым яе ўдзеле ў выбарах будзе ёй зададзена.

Ці варта разглядаць кандыдатуру Квасьнеўскай сур'ёзна? У гэтым сумняваецца сацыёлаг з Польскай акадэміі навук Артур Волэк. Ён нагадвае, што Іяланта Квасьнеўская ўжо пяць гадоў таму прыглядвалася да перспектывы ўдзелу ў прэзідэнцкай кампаніі, але так і не вырашылася. Палітолаг Яцэк Клачкоўскі з кракаўскага Цэнтра палітычнай думкі лічыць, што Квасьнеўская ззяе адлюстраваным бляскам свайго мужа. Пры гэтым, на здзіўленне, да яе не прыстаюць усе аферы мужа ў бытнасць яго прэзідэнтам. Палякі звязваюць яе імідж толькі са станоўчымі і прыемнымі падзеямі, такімі, як, напрыклад, замежныя візіты або дабрачынная дзейнасць. «Пані Іолю» як жонку кіраўніка дзяржавы палякі вельмі паважалі і любілі.

Аднак асобныя аналітыкі лічаць, што ў прэзідэнцкай гонцы ёй можа бракаваць палітычнага досведу. Невядома, як бы яна выглядала ў тэлевізійных дэбатах з прэм'ерам у выпадку дыскусіі, напрыклад, па эканамічных праблемах. Некаторыя правыя палітыкі глядзяць на магчымае балатаванне «пані Іолі» з іроніяй. Па меркаванні Стэфана Несялоўскага, у спісе кандыдатаў у аднолькавай меры з Квасьнеўскай магла б апынуцца Брыджыт Бардо. Або, з'едліва заўважае палітык Марэк Саскі з партыі «Закон і справядлівасць», лялька Барбі.

Сацыёлагі таксама спрабуюць змадэляваць паядынак Туска з цяперашнім прэзідэнтам. Што датычыцца польскіх левых, то яны ў выпадку адмовы ад балатавання Іяланты Квасьнеўскай, апынуцца ў цяжкай сітуацыі. Уладзімеж Цімашэвіч (у розны час займаў пасады міністра юстыцыі, прэм'ер-міністра, спікера парламента) прайграе цяперашняму прэм'еру ў суадносінах 33 да 67. На шанцы атрымаць перамогу ў сутычцы з Тускам не могуць таксама разлічваць іншыя вядомыя польскія палітыкі, напрыклад, намеснік прэм'ер-міністра і лідар Польскай сялянскай партыі Вальдэмар Паўляк.

Такім чынам, звесткі апытання сведчаць аб пэўных шанцах Квасьнеўскай на поспех. 39 працэнтаў удзельнікаў сацыялагічнага даследавання лічаць, што выбар Квасьнеўскай быў бы добрай кандыдатурай для прэзідэнцкага крэсла, 6 працэнтаў перакананыя, што яна прайграла б выбары ў другім туры, 5 працэнтаў не даюць шанцаў ёй на выхад у другі тур, 48 працэнтаў лічаць Квасьнеўскую непрыдатнай для палітыкі.

Як бы тое ні было, а інтрыга на выбарах прэзідэнта Польшчы завязваецца цікаўная. За год можа адбыцца ўсякае. І хто ведае, а раптам і Іяланце засвеціць зорка вялікай палітыкі, як, напрыклад, жонцы былога амерыканскага прэзідэнта Біла Клінтана — Хілары.

**Міхаіл БАЦЯН.**

**Нічога асабістага**

# Чамадан. Вакзал. Кватэра



.— Не! Без усялякіх варыянтаў — не. Нават на лета, — катэгарычна і беспаваротна адрэзаў дырэктар студгарадка Міхаіл Барысавіч, правёў невялікую лекцыю на тэму а-ля «студэнтаў шмат, а інтэрнатаў кот наплакаў» і зрабіў выгляд вельмі занятага чалавека, маўляў, размова закончана.

Сказаў я Мікалаю Барысавічу «дзякуй» (хоць за што?) і пайшоў на вуліцу. Сеў на лаўку і пачаў разважаць сам сабе. Чатыры гады таму я сядзеў якраз на гэтым месцы. Прыехаў я тады ў сталіцу вучыцца. Паступіў у вядучую ВНУ краіны. Сядзеў і кумекаў, дзе б знайсці дах над галавой, бо ў студэнцкім інтэрнаце на мяне месца не хапіла... Варушыў звілінамі, а побач туды-сюды гойсалі замежныя госці: кітайцы, арабы, афрыканцы — для іх месцы ў інтэрнаце чамусьці знайшліся. Прайшло чатыры гады — і я зноў сяджу на гэтым месцы. Шмат вады ў Свіслачы з тых часоў сплыло, а сітуацыя амаль тая ж: вакол замежнікі, а я зноў сяджу без інтэрната. Хіба толькі кітайцаў пабольшала, дый я ўжо на пяты курс перайшоў і трохі грошай на кватэру зарабіць у стане. Дзякуй Богу, тады мне, першакурсніку, месца ў інтэрнаце адшукалі. І пражыў там шчасліва 4 гады. А на пяты выйшла асечка: маўляў, чалавек дарослы, круціся як хочаш. Ды не ў аднаго мяне паўстала такая праблема, а ва ўсіх маіх аднакурснікаў, хто несірата/чарнобылец/кітаец.

У прынцыпе, мо яно і да лепшага. Трэба ж калісьці пачынаць самастойнае жыццё ды мець свой, а не казённы кут. Падбадзёрыў я сябе такім чынам і паплёўся дадому абдумваць план баявых дзеянняў пад кодавай назвай «Пошук кватэры». На ўсё пра ўсё заставаўся роўненька тыдзень, а потым — з рэчамі на выхад.

Самае галоўнае было вызначыцца, з кім з сяброў здымаць разам кватэру. Бо абы з кім не хочацца, а аднаму жыць — буржуйства. Дзякуй Богу, перад маім суседам па інтэрнацкім пакойчыку паўстала тая ж праблема і мы вырашылі працягнуць сумеснае жыццё (толькі, крый Божа, не падумайце чаго непрыстойнага) і на кватэры. Крок наступны — само жытло. Апытанне знаёмых варыянтаў са свабоднымі кватэрамі плёну не прынесла. У агенцтва таксама звяртацца не хацелася — ага, вынь ды пакладзі ім грошыкі ў выглядзе амерыканскіх прэзідэнтаў. Таму мы вырашылі стаць паслядоўнікамі Скарыны: надрукавалі стос паперы з тэкстам аб'явы «найму кватэру», парэзалі і пайшлі абклейваць Мінск. Прычым абклейваць татальна: усе прыпынкі на больш-менш вялікіх вуліцах тых раёнаў, дзе ёсць навабудоўлі ці дзе б нам хацелася жыць. Эх, псаваць прыпыначныя навесы і слупы не вельмі хацелася, але ж толькі на адным прыпынку мы знайшлі спецыяльную дошку для абвестак. Так што сэ ля ві, паважаныя працаўнікі камунальных службаў.

...Спачатку было страшна: а раптам ніхто не патэлефануе? А раптам дарэмна губляем час, сілы, абутак і клей? Мо адразу ісці ў агенцтва і адшпіліць ім сотню баксаў за пошук?.. Але калі літаральна праз паўгадзіны пасля пачатку абклейкі на мабіле высвеціўся сяброў нумар і нейкі мужчына прапанаваў кватэру — на душы палягчэла і імпэту прыбавілася.

Доўга лады разводзіць з падрабязнасцямі пра пошук даха над галавой не буду. Скажу толькі, што з раніцы да вечара мне на мабільнік званілі і званілі. Калі б я запісваў усе варыянты, нават якія нам не падыходзілі, то назбіраў бы кватэрную базу на паўсотні пазіцый. А так мы праехаліся па некалькіх кватэрах і такі знайшлі сабе прыстойную з нармальным балансам цана/месцазнаходжанне. Ну а паколькі за гэты тыдзень я, можна сказаць, празандзіраваў рынак сталічнай арэнды, то вазьму на сябе смеласць даць пару парад тым, каму яшчэ давядзецца шукаць жылы куточак.

Па-першае, знайсці кватэру праз абвесткі — поўнасцю рэальна. Пры гэтым яшчэ можна і круціць носам, нешта перабіраць. Не ведаю, як сітуацыя зменіцца ўвосень, але зараз прапаноў дастаткова. Па-другое, смела таргуйцеся. У мяне склалася ўражанне, што на 30—40 долараў гаспадары кватэр кошт падымаюць: маўляў, а раптам кватарант не будзе таргавацца і пагодзіцца. Так што калі вам кажуць 300 долараў за двухпакаёвую без мэблі — скажыце, што ваш ліміт — 260. Пасля некаторых ваганняў можаце ўдарыць па руках з гаспадаром і дамовіцца не на 300, а хоць бы на 270. Прынамсі, зараз двухкапаёўку можна спакойна знайсці і ў межах 230—270, але ў сярэднім — 250 у.а. Калі шукаеце аднапакаёвую, то арыентуйцеся на 200 долараў. Плюс ці мінус будзе залежаць ад яе стану, наяўнасці мэблі, аддаленасці ад цэнтра і метро.

Ну і безумоўна, усе варыянты трэба глядзець і да дробязяў распытваць гаспадароў. А то патэлефанаваў адзін дзядзька і прапанаваў амаль што ў цэнтры трохпакаёўку за 250. Паехалі глядзець, а там — прыватны дамок у стане як пасля бамбёжкі, адзін пакой прахадны, а ў двух астатніх месца хапае роўненька на ложак. Ну а гаспадар усё нешта талдычыў пра рамонцік і намякаў, што няблага б нам, наймальнікам, яго зрабіць. Ну-ну, знайшоў Рафшана і Джамшута.

А ад некаторых прапаноў ну вельмі цяжка было адмовіцца. Адна жанчына прапанавала наняць пакойчык у яе чатырохпакаёвай кватэры. Яе маналог у тэлефонную слухаўку быў прыкладна такі: «Добры дзень, малады чалавек. У мяне для вас ёсць ну проста ідэальны варыянт — яшчэ ў кватэры з вамі будуць жыць тры дзяўчынкі. Прыгожыя, разумныя, сціплыя, ахайныя. Дый я гаспадыня не старая яшчэ... Так што можаце самі засяляцца, а калі з сябрам — то і яго бярыце». Вось як ад такога можна адмовіцца? :)

Мучыць сумленне, што і нейкаму хлопцу адмовіў. Ён прапанаваў пакой у трохпакаёўцы: большы пакой — 210 долараў, меншы — 140. Ну а ў трэцім ужо нехта жыве. Я так палічыў — 210 плюс 140 ну і плюс яшчэ мінімум 140 — дык мне нават шкада стала такога сіротку, які з адной кватэры 490 баксаў за месяц мае. Відаць, зусім бедна жыве, што такія грошы атрымліваць хоча. Эх, ну як я мог адмовіць такому гаротніку?.. :)

А наогул, перамена месцажыхарства прымусіла задумацца над глабальнымі жыццёвымі пытаннямі. Заходзіш у кватэру ў новабудоўлі і так становіцца шкада, што ты яе толькі наймаеш — на месяц, год, два... І плаціш шалёныя грошы за пару дзясяткаў квадратных метраў. А нехта атрымаў такую ж кватэру ва ўласнасць. І можа там спакойна абжывацца, без страху, што праз нейкі час грузавое таксі з рэчамі паедзе да новага жытла... Эх, дзе б грошай набрацца, каб займець такую ж сваю жылплошчу? Хіба што латарэйку купіць?..

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Не пусціць АЦЁК на самАЦЁК

Уся вада, з якой складаецца чалавечы арганізм, «упакаваная» або ў крывяносныя і лімфатычныя сасуды, або ўнутры клетак. Калі чалавек захворвае, вадкасць выходзіць са свайго натуральнага рэчышча — і з'яўляюцца ацёкі.

Амаль заўсёды ацёкі — сімптом нейкага захворвання. А не ўзросту, як лічаць многія. Хоць цалкам зразумела, чаму ацёкі асацыююцца са старасцю. Яны ўзнікаюць пры наступных немачах: паніжаны ўзровень бялку ў крыві; хваробы нырак, пры якіх бялок страчваецца з арганізма з мачой; хваробы печані, калі бялок не сінтэзуецца ў неабходнай колькасці; недахоп бялку ў рацыёне (хваробы, якія суправаджаюцца парушаным усмоктваннем у кішэчніку; галаданне); павышаная пранікальнасць капіляраў; хваробы сэрца (хранічная сардэчная недастатковасць); вянозны трамбоз; тромбафлебіт венаў канечнасцяў; варыкозная хвароба ног.

Усе пералічаныя хваробы характэрныя для людзей састарэлага ўзросту. Таму вельмі часта менавіта тыя, каму «за», пакутуюць ад ацёкаў. Самі па сабе ацёкі не лечацца. Неабходна шукаць іх прычыну і ў першую чаргу лячыць яе. Таму, калі ў вас з'явіліся ацёкі, абавязкова звярніцеся да доктара.

**НАРОДНЫЯ СРОДКІ, ЯКІЯ ПАЛЯГЧАЮЦЬ СТАН ПРЫ АЦЁКАХ**

● бярозавае лісце: 20 г сыравіны заварыць адной шклянкай гатаванай вады. Астудзіць, дадаць соды (на кончыку нажа), размяшаць, настояць на працягу 4 гадзін, працадзіць. Прымаць у 2 прыёмы з прамежкамі ў 4 гадзіны;

● корань ажыны: 1 ст. лыжку здробненага кораня заліць шклянкай кіпеню, варыць 7—10 хвілін, астудзіць, працадзіць, прымаць па 1 ст. лыжцы праз кожныя 2 гадзіны;

● піжма агародная: 1—2 ч. лыжкі лісця і кветак заліць 250 мл кіпеню і настояць на працягу 30 хвілін. Піць па 1/2 шклянкі 3—4 разы на дзень.

**А ТАКСАМА ВЫКАРЫСТАЙЦЕ...**

● Адвар астрагалу: 10 г сыравіны запарце шклянкай кіпеню, астудзіце і працадзіце. Прымаць па 2—3 ст. лыжкі 2—3 разы на дзень на працягу 2 тыдняў. Пасля 3-дзённага перапынку курс лячэння паўтарыць.

● Мазі, у склад якіх уваходзяць руцін ці гепарын, умацоўваюць капілярную сетку. Добра дзейнічаюць мазі, выробленыя на аснове конскага каштану.

● Масаж і ванначкі. Дадайце ў ваду марскую соль. На 5—10 хвілін апусціце ногі ў халодную ваду, затым лёгкім пашчыпваннем масіруйце ацёкшыя ўчасткі знізу ўверх.

**ГІМНАСТЫКА ДЛЯ НОГ**

● Устаньце на насочкі і пастойце некалькі секундаў, затым зрабіце 5—10 скачкоў на дыбачках.

● Сядзьце на крэсла, падыміце ногі і рабіце вярчальныя кругавыя рухі ступнямі.

● Сагніце пальцы ног і рэзка разагніце.

***Увага! Пасля 19 гадзін старайцеся піць вадкасці як мага меней.***

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# ТРЫ «РЭХІ» ВАЙНЫ ЗА ДЗЕНЬ

**У Віцебскай вобласці ўсяго толькі за адзін дзень у трох розных месцах з зямлі дасталі снарады і міну часоў Вялікай Айчынай вайны.**

Спачатку падчас сельскагаспадарчых работ на полі ля вёскі Сталюгі Лепельскага раёна знайшлі два артылерыйскія снарады калібру 45 міліметраў.

А пры выкананні земляных работ у кар'еры ля вёскі Макарава Віцебскага раёна знайшлі тры артылерыйскія снарады калібру 105 міліметраў. У той жа вечар у Віцебскім раёне жыхар вёскі Кукавячына на сваім прысядзібным участку знайшоў мінамётную міну. Увесь гэты «арсенал» часоў вайны вывезлі сапёры і знішчылі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Дзве даты

## 10 ліпеня

**1857 год** — нарадзіўся Анатоль Бонч-Асмалоўскі, рэвалюцыянер-народнік, член арганізацый «Зямля і воля» і «Чорны перадзел». У 1879 г. арыштаваны, высланы ў бацькаўскі маёнтак Блонь (цяпер Пухавіцкі раён). Удзельнічаў у стварэнні падпольнай друкарні арганізацыі «Чорны перадзел» у Мінску. У 1882 г. арыштаваны, пасаджаны ў турму. Адбыўшы пакаранне, арганізаваў у Блоні з жонкай сялянскі гурток самаадукацыі, з сярэдзіны 1880-х гадоў пératварыў Блонь у апорны пункт рэвалюцыянераў розных кірункаў (народнікаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў). Быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў Працоўнай партыі палітычнага вызвалення Расіі і Блонскай сялянскай арганізацыі. Падчас рэвалюцыі 1905-07 гадоў ваяваў на барыкадах Прэсні ў Маскве. Дэлегат Усебеларускага з'езду 1917 года.



**1925 год** — у горадзе Дэйтан (ЗША) пачаўся так званы «працэс малпаў» над настаўнікам Джонам Скоўпсам, які першым асмеліўся выкладаць тэорыю эвалюцыі — гістарычнага развіцця арганічнага свету Зямлі паводле вучэння Ч. Дарвіна.

Цытата дня

*«Дыпламат заўсёды ведае, што спытаць, калі не ведае, што адказаць».*

**Канстанцін Меліхан.**

Свет і сусвет чалавека

# ДОЖДЖ

**Самсона ў народзе называлі «сенагноем», таму што «Самсон сена гноіць». Па гэтым дні вызначалі надвор'е на некалькі тыдняў наперад: калі быў дождж, меркавалі, што ён працягнецца яшчэ некалькі тыдняў; калі ж было суха і цёпла — так будзе і надалей.**

**Дождж у народнай культуры атаясамліваўся з апладатвараючымі зямлю сіламі, сімвалізаваў пладаноснасць, быў повяззю зямлі і неба. У хрысціянскай культуры дождж параўноўвалі з жыццёвай сілай душы, якая прымушае цела рухацца, змагацца, жыць. Лічылася, што дождж — гэта Боскі дар, які сыходзіць з высокага неба ў выглядзе кропляў. Таму адсутнасць даждж ці наадварот, працяглыя дажджы, успрымаліся як пакаранне за людскія грахі.**

● Часам функцыяй ахоўніка дажджоў надзялялі святога Іллю, які «цягне за сваёй калясніцай цэбар, поўны вады, і пакрысе лье з яго на зямлю». Калі ж святога Іллю нечым угнявілі, наступае паводка. У некаторых рэгіёнах існаваў звычай пры моцнай спякоце, калі не было дажджоў, ісці да ракі ці крыніцы і апускаць туды абраз з выявай Іллі-прарока.

● Сярод усходніх славян было распаўсюджана меркаванне, што ўладу над дажджом маюць прадстаўнікі таго, «іншага» свету, звычайна, «задушныя» памерлыя — тапельцы, вісельнікі, самазабойцы. Іх звалі «ўладарамі хмар» — нябесных статкаў кароў, авечак, быкоў. Да іх звярталіся падчас засухі, падчас працяглых дажджоў, якія нішчылі ўраджай: «Гэй, вы, тапельцы, забярыце да сябе белых авечак!».

● У народзе верылі, што працяглыя дажджы ідуць таму, што недзе да вады паставіліся з непавагай, г.зн. недзе ёсць тапелец. І пакуль яго не выцягнуць з вады, у пакаранне столькі яшчэ будзе ісці дождж, які знішчыць ураджай.

● Дождж стаў сімвалам дабрыні і зла ў жыцці чалавека. Лічылася, калі падчас вяселля пойдзе дождж, сям'я будзе жыць з пастаянным прыбыткам. Дождж у пачатку любой справы (напрыклад, напачатку будаўніцтва хаты, капання калодзежа і г.д.) ці шляху сімвалізаваў поспех, добры вынік працы.

● Падчас моцнага дажджу ўвогуле непажадана было хаваць чалавека, каб не «закапаць» дождж і не наклікаць новую бяду.

● Да дажджу, які ідзе пры сонцы, заўсёды былі станоўчыя адносіны. Такі дождж звалі благім, грыбным, сляпым, лічылася, што дзеці, якія трапілі пад такі дождж, будуць лепш расці і гадавацца.

● Калі кветкі, травы з раніцы вытачаюць больш моцны пах, будзе дождж.

**Ад працяглага дажджу**

*«Як настойніка свянціла, я тучы не бачыла. Тучы — адлятучы, ідзіце на сухія землі, на сухія староны, а маю хату мініце».*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

**На конкурс апавяданняў**

Апавяданне

# ЖМЕНЬКА СЕМАК

**Валянцін КРЫЖЭВІЧ**

***Як мала чалавеку ад чалавека для спагады і дабрыні трэба. Усяго толькі жменька семак. А мы вылузваемся, б'ём сябе ў грудзі на трыбунах і плошчах, даказваючы, як шчыруем і рупімся дзеля дабрабыту сваіх блізкіх. А аказваецца, каб гэта было праўдай, каб цябе зразумелі і пачулі, трэба зусім нічога — усяго толькі жменька семак. Якраз пра гэта не без усмешкі і распавядае нам Валянцін Крыжэвіч з горада Чавусы.***

**Віктар КАЗЬКО.**

У пашпарце Аўгінні Дуброўскай яе імя было запісана як Яўгенія. Але неяк так склалася ў мясцовым маўленні, што ледзь не з маленства яе сталі называць Аўгінняй. Зараз ёй ужо ладнага за 70, нават вайну з немцамі крыху памятае. Жыццё не сказаць каб песціла, аднак і не горш, чым у многіх іншых. Працаваць у калгасе стала з падлеткавых гадоў, нават у свой час брыгадзірам была, нягледзячы на тое, што скончыла толькі 6 класаў. Выйшла замуж за майстра з леспрамгаса, дваіх сыноў нарадзіла. Тыя, як выраслі ды пайшлі ў армію — так адтуль і не вярнуліся.

Не, не падумайце чаго дрэннага — проста не захацелі ў вёску, бо хоць і весела тады было там, затое бедна. А вырвацца ў людзі няпроста, бо пашпартоў вяскоўцам не выдавалі. Хіба толькі паступяць куды вучыцца або ў тую ж армію забяруць. Праўда, мог і старшыня калгаса даведку напісаць, што, маўляў, адпускае. Толькі ж рэдка які старшыня рабіў гэта задарма... Прыгон, адным словам, хоць быццам бы яго і адмяніў цар яшчэ ў 1861 годзе. Прынамсі, так пісалі ў падручніках.

Вось і атрымалася, што адпрацавала Аўгіння ўсё сваё дарослае жыццё ў калгасе так званым палядводам, і далей райцэнтра нікуды не ездзіла. Нават да сыноў, бо жылі яны з сем'ямі далёка: адзін у расійскім Брацку, другі — у Казахстане, цаліну там падымаў. Сыны і ў часы Савецкага Саюза не часта наведваліся, а цяпер, калі на білет шалёныя грошы трэба, дык толькі іншы раз патэлефануюць, пацікавяцца, як здароўе, — і ўсё.

А здароўе — якое яно ў старога чалавека... Вунь вучоныя па тэлевізары кажуць, што старасць — гэта хвароба. І ўсё шукаюць, як яе вылечыць. Выходзіць, што калі ты стары, то ўжо хворы, нават калі ў цябе нічога не баліць. Але якое там не баліць... На сялянскай працы так наламалася, што ўсе косці ныюць... Аднак няхай сабе — нездарма ж ёсць такі жарт: калі вы раніцай прачнуліся і ў вас нічога не баліць, значыць, вы памерлі.

Паміраць Аўгіння не збіралася, таму зрэдку наведвалася ў раённую бальніцу. Вось і сёння рашыла нанесці чарговы візіт дактарам. Мужу наказала, каб прыглядваў за гаспадаркай, не забыў свіней і курэй пакарміць, і падалася на прыпынак. Дзякуй Богу, хоць два разы на тыдзень, але пасажырка, так старыя па прывычцы называлі аўтобус, заходзіла ў іхнюю вёску рэгулярна. На прыпынку людзей было няшмат, чалавек 7: хто таксама ў бальніцу, хто ў гарадскую краму, хто па іншых патрэбах...

Пакуль тая пасажырка, Аўгіння пачала лушчыць гарбузовыя семкі, якія прыхапіла з сабой. Бо чакаць у многіх месцах трэба: і на прыпынку, і ў аўтобуснай станцыі, і ў рэгістратуры паліклінікі, і на прыём да ўрача. А з семкамі час непрыкметна ляціць... Аўгіння не смеціла, не — яна адшчыпвала краі семак у працы загартаванымі, як жалеза, пазногцямі, зярнятка адпраўляла ў рот, а шалупінне — у кішэню курткі або кофты, каб потым вытрасці ў зручным месцы. Увогуле акуратнасць — гэта было ў характары Аўгінні, а таму і ў хаце ў яе заўсёды чыста, і на падворку таксама.

...У паліклініцы Аўгіння хвілін 20 адстаяла ў чарзе ў рэгістратуру, атрымала талончык і паднялася на другі паверх, дзе быў кабінет урача. Пад дзвярыма — таксама чарга. Нават на лаўкі людзі ў большасці не садзяцца. Аўгіння села, бо ногі не купленыя, да таго ж якраз іх лячыць збіраецца. У чаканні пачала зноў паціху лушчыць семкі. Маладзіца, якая сядзела побач, спачатку скоса паглядвала на Аўгінню, але прыкмеціўшы, што жанчына абыходзіцца з семкамі акуратна, заўважыла:

— А вы ведаеце, што гарбузовыя семкі ад гельмінтаў дапамагаюць?

— Ад чаго, ад чаго? — не зразумела Аўгіння.

— Ад глістоў...

— Ды ну!.. Во не ведала... А я ж усё жыццё семкі ем... А наце і вам, — яна зачэрпнула з кішэні семак і працягнула жменьку маладзіцы.

Тая спачатку аднеквалася, але ўсё ж узяла і, загарнуўшы ў папяровую кузеньку, паклала ў сумачку. Потым, імкнучыся хоць нечым аддзякаваць, сказала:

— Вы, я бачу, з вёскі. Дык чаго тут седзіце — вяскоўцаў жа ў першую чаргу пускаюць, каб на аўтобус паспелі.

— Во як!.. Гэта добра, калі так, а то мне яшчэ і ў банк трэба... З паўгода назад паклала на кніжку крыху грошай, дык пацікаўлюся, колькі працэнтаў нарасло...

Аўгіння паднялася з лаўкі і падалася бліжэй да дзвярэй урачэбнага кабінета. У чарзе забурчэлі:

— Куды лезеш, бабуля? Мы першыя прыйшлі...

Маладзіца з лаўкі гучна прагаварыла:

— Прапусціце! Яна з вёскі, яшчэ на аўтобус спозніцца... Што ж ёй — у гасцініцы начаваць?..

На гэты раз народ у чарзе падабраўся свядомы. Аўгінню прапусцілі ўшчыльную да дзвярэй. І як толькі кабінет пакінуў пажылы мужчына, Аўгіння ўвайшла туды. У кабінеце стаялі два сталы, за адным сядзеў урач у белым халаце, за другім — медсястра.

— Сядайце, — паказаў урач на стул, — на што скардзіцеся?

І з гэтымі словамі, не чакаючы адказу, пачаў гартаць медкартку.

— Ды ногі нешта ў каленях сталі ламаць, каб лякарства якое...

— Так, так... — урач працягваў гартаць картку, затым звярнуўся чамусьці да медсястры: — Артрыт у бабулі... Не першы раз у нас, вось тут напісана...

Аўгіння палічыла, што пара звярнуць увагу і на яе, таму дастала з кішэні кофты жменьку семак і сыпанула іх на стол урачу, потым яшчэ жменьку — медсястры, прыгаворваючы:

— Во, частуйцеся, добрыя семкі... Кажуць, ад глістоў ратуюць...

Медсястра чмыхнула.

Урач адарваўся ад карткі, засмяяўся.

— Ну, вы... — зірнуў у картку, — Яўгенія Пятроўна, арыгінал... Семкі... Ад глістоў... Ёсць, ёсць такое меркаванне... Толькі ад артрыту семкі не ўратуюць... Мы вам прапішам што-небудзь больш дзейснае...

— Толькі каб не надта дарага... А то ў мінулы раз напісалі рэцэптаў ледзьве не на паўпенсіі...

— Добра, добра, — заўсміхаўся ўрач, гартаючы нейкі даведнік, — ёсць тут нешта новае айчыннай вытворчасці... Адносна танна і лячэбны эфект неблагі...

І ці то жартам, ці то ўсур'ёз дадаў:

— Калі ўжо семкі... То як вы да нас, так і мы да вас...

У банк Аўгіння трапіла якраз пад абедзенны перапынак. З уласнага досведу ведала, што ў гэты момант ці ў якой канторы, ці ў сельмагу могуць і на дзверы паказаць, маўляў, трэба паперы падшыць ці касу падлічыць, ці яшчэ якая трасца ў бок... Таму адразу сыпанула на высокую стойку, з-за якой ледзь бачна была аператар за камп'ютарам, жменьку семак.

— Во, добрыя семкі, ядроныя... Частуйся, дзетка... А то, можа, калі дача ёсць, пасадзіш... Гарбузы па кабану вырастуць...

І столькі шчырасці было ў словах старой жанчыны, што аператар заўсміхалася, згарнула семкі са стойкі сабе на аркуш паперы, узнімаючы ў паветра бліскучыя лускавінкі.

— Дык што вы хочаце?

— Грошы я паклала ў ваш банк... Хачу даведацца, колькі працэнтаў нарасло.

— Давайце пашпарт.

— Пашпарт?.. А я ж не ўзяла, думала, што так можна...

Аператар завагалася было, але зірнула на кліентку, на жменьку семак, што ляжалі на аркушы, уздыхнула і сказала:

— Добра, гаварыце ваша прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства... Паспрабую ў камп'ютары знайсці.

Аператар пашчоўкала клавіятурай і літаральна праз хвіліну назвала ўслых пашпартныя звесткі Аўгінні, каб зверыцца. Потым растлумачыла, колькі працэнтаў налічана і якім чынам можна змяніць умовы ўкладу на больш выгадныя. Толькі трэба прыехаць абавязкова з пашпартам.

З банка Аўгіння выйшла задаволеная, бо па гадзінніку ўстановы бачыла, што і на «пасажырку» не спозніцца. Палезла ў кішэню кофты па семкі, але там было пуста...

**Усміхнёмся!**

**Жанчына павінна дапамагаць мужчыну рабіць усё самому.**

☺

Прыехаў наш «новы» на паляванне на мядзведзя. Джып магутны, спецыяльны камуфляж, аўтамат з аптычным прыцэлам начнога бачання.

Заходзіць у лес, а насустрач яму мужык у лапцях, у вушанцы і ў целагрэйцы.

— Куды, мілы чалавек, сабраўся?

Наш «новы»:

— На мядзведзя!

— Вось як? Але ж няўдзячны гэта занятак. Мядзведзь — гаспадар! На яго мужыкі і з рагацінай хадзілі, і з сякерай, і са стрэльбай — і ўсё дарэмна!..

— Ды ты глядзі! Гэты аўтамат — слана заваліць! Калібр, оптыка, кулі з браніраваным стрыжнем!

Сказаў і пайшоў у лес. Мужык зацягваецца самакруткай:

— Та-а-ак, зараз у лес наогул хадзіць небяспечна... У мядзведзя і так ужо рагаціна, сякера і стрэльба, а цяпер яшчэ і аўтамат будзе...

☺

**Прыязджае муж з камандзіроўкі. Адразу бяжыць да шафы, адчыняе — нікога! Нахабны голас з ложка:**

**— Тут я!**




## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства**

**Аукцион состоится 11 августа 2009 г. в 11.00 в г. Минске по ул. Чкалова, 5 к. 320.**

**Организатор аукциона:** фонд «Минскоблгосимущество», 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. 5004710, 2243976

**Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет, 222120, Минская обл., ул. Чапаева, 6

| Предмет аукциона, целевое назначение, адрес, кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Срок аренды земельного участка, лет | Начальная цена продажи права аренды, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| Земельный участок для строительства транспортно-логистического центра, расположенный по адресу: Минская область, Борисовский район, Неманицкий с/с, д. Ланковщина на 449 км участка автомобильной дороги М-1/Е30 и 60 км участка автомобильной дороги Р-53. Кадастровый номер: 620800000001000698 | 30,00 | 51 | 57 774 717 | 5 000 000 |

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт площадью – 0,4620 га и охранная зона линии связи и радиофикации площадью – 0,1648 га. Подъезд к земельному участку будет осуществляться по существующей дорожной сети. Для инженерного обеспечения возможно использование существующей сети.

**Условия для победителя аукциона, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:**

внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

возместить расходы, связанные с проведением аукциона (в сумме 831 тыс. рублей) и формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе государственной регистрацией изменения земельного участка республиканского унитарного сельскохозяйственного производственного предприятия «Свинокомплекс Борисовский» и в отношении создания земельного участка (в сумме 1 177 тыс. рублей);

возместить в установленном порядке убытки в сумме 73659820 рублей, причиненные республиканскому унитарному сельскохозяйственному производственному предприятию «Свинокомплекс Борисовский» изъятием земельного участка;

возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 1193455200 рублей, вызванные изъятием 30,00 га сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, перечислив их на транзитный счет инспекции Министерства по налогам и сборам по месту регистрации в качестве плательщика;

заключить с Борисовским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в установленном порядке государственную регистрацию права на этот участок;

в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставленный земельный участок приступить к занятию данного участка;

в месячный срок после государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в Борисовском райисполкоме архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства и о разрешении проектирования этого объекта;

разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

приступить к строительству объекта после утверждения строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ;

снять перед началом строительства на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту рекультивации;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и согласованные с Минским облисполкомом.

**Для участия в аукционе** гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, организатору аукциона представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Если победитель аукциона в день проведения аукциона не подписал протокол, результаты аукциона по решению комиссии или организации в отношении этого победителя аннулируются. При этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Споры, возникшие в ходе проведения аукциона, разрешаются комиссией по проведению аукциона. Борисовский райисполком имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Возможность ознакомления с земельным участком обеспечивает арендодатель земельного участка в срок до 7 августа 2009 г.

Внесение **задатка** производится путем перечисления на текущий (расчетный) счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686. Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224-39-76, 500-47-10**

Последний день внесения задатка и подачи заявок **7 августа 2009 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников 11 августа 2009 г. с 10.00 до 10.50.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**ОАО «Минский приборостроительный завод»**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже:

**Лот 1.** Автомобиль МАЗ 53366022 1994 г.в.э.*
Начальная цена 13 840 000 руб. с НДС.
**Лот 2.** КамАЗ 53213 1988 г.в.э.
Начальная цена 6 241 000 руб. с НДС.
**Лот 3.** Автомобиль ЗИЛ 43141 1986 г.в.э.
Начальная цена 2 990 000 руб. с НДС.
**Лот 4.** Автомобиль ЗИЛ 5301 АО 1998 г.в.э.
Начальная цена 3 619 000 руб. с НДС.
**Лот 5.** Автомобиль Москвич 214145 1998 г.в.э.
Начальная цена 520 000 руб. с НДС.

Всю необходимую информацию, а также условия проведения аукциона можно получить по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Контактный телефон 8 (017) 293 94 33, 293 99 60, факс 331 41 97.

Аукцион состоится 10 августа 2009 г. в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 7 августа 2009 г. до 16.00.

* г.в.э. — год ввода в эксплуатацию.

**У суд Любанскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **БРАГІНЕЦ Вольгі Іванаўны**, 20 кастрычніка 1976 года нараджэння, ураджэнкі в. Сарочы Любанскага раёна, апошняе вядомае месца жыхарства: в. Падбярэжжа, д. 36 Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Брагінец В. І., паведаміць суду Любанскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**Уведомляем акционеров ОАО «Березовский сыродельный комбинат»**, что учет прав на ценные бумаги общества осуществляет депозитарий УП «Совмедиа», г. Минск, пер. Северный, 13, тел. 8 0172 13 54 72. УНП 100893381.

**Бланк № 0537441** лицензии № 50000/0537441, выданный 18.06.2009 г., **считать недействительным.**

